Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 ЖНІЎНЯ 2007 г.
ЧАЦВЕР

№ 143 (26008)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«ЗВЯЗДА» МАЯ...

Увага, конкурс!

Адзін з неафіцыйных лозунгаў «Звязды» — да чытача з любоўю. За амаль 90-гадовую гісторыю існавання газеты супрацоўнікі яе не раз пераконваліся, што пачуццё гэта нязгаснае і ўзаемнае, якому не перашкаджаюць ні адлегласці, ні час.

Напярэдадні юбілею мы з удзячнасцю прымаем віншавальныя званкі і лісты, выслухоўваем добрыя словы і слушныя заўвагі. З цікавасцю гартаем старонкі летапісу «Звязды». Але без вас, шаноўныя чытачы, гэты летапіс няпоўны. Менавіта таму мы абвяшчаем вялікі агульны збор. Ці былі ў вашым жыцці праблемы — дробныя ці вялікія, — якія дапамагла вырашыць менавіта «Звязда»? Можа, для кагосьці газетная публікацыя стала кропкай у зацягнутай спрэчцы з чыноўнікамі, для кагосьці — нязменным дарадцам у гаспадарчай працы, а для кагосьці — пачаткам творчага шляху? А мо ў вашым архіве захаваліся здымкі, дзе вы разам са «Звяздой» — у самым трывіяльным або самым неверагодным месцы? Падзяліцеся, калі ласка, гэтымі гісторыямі і ўспамінамі з рэдакцыяй — вашых лістоў чакаем на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда» — з пометкай «Звязда» мая». Гісторыі абавязкова будуць надрукаваныя ў бліжэйшых нумарах, а аўтараў найбольш цікавых аповедаў і фатаграфій гарантавана чакаюць прызы.

Беларусь спадзяецца на больш хуткае ўрэгуляванне пытанняў з «Газпрамам» па далейшых пастаўках расійскага газу

Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА памочнік міністра энергетыкі Беларусі Андрэй Жукаў. Беларускім бокам атрымана тэлеграма ад кіраўніцтва ААТ «Газпрам» аб намеры расійскай кампаніі з 3 жніўня на 45 працэнтаў скараціць аб'ём паставак газу ў Беларусь.

Паводле слоў Андрэя Жукава, беларускі бок цяпер рыхтуе свае прапановы «Газпраму» для ўрэгулявання сітуацыі. Гэта пытанне цяпер абмяркоўваецца ў беларускім урадзе з удзелам кіраўніцтва ААТ «Белтрансгаз».

У Беларусі стаўка экспартнай пошліны на нафту з 1 жніўня павялічана да $223,9 за 1 тону

Урад Беларусі павялічыў стаўку экспартнай пошліны на сырую нафту. З 1 жніўня 2007 года яна складае $223,9 за 1 тону супраць ранейшых $200,6. Да ўзроўню расійскіх павялічаны таксама з 1 жніўня экспартныя пошліны на нафтапрадукты. Гэта рашэнне прынята ў сувязі з тым, што з 1 жніўня такія памеры пошлін устаноўлены ў Расійскай Федэрацыі.

БЕЛТА.

Сабрана амаль 4 млн тон збожжа

Валавы збор збожжа ў Беларусі на раніцу 1 жніўня склаў 3 млн 895 тыс. тон, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Паўлоўскі. У мінулым годзе на аналагічную дату было намалочана крыху больш як 1,5 млн.тон.

У ліку лідараў па намалоту збожжа — гаспадаркі Мінскай вобласці. Яны першыя ў рэспубліцы перасягнулі мільённую аднаку — да 1 жніўня на рахунку сталічнай вобласці 1 млн. 63,6 тыс.тон. У Гродзенскай вобласці намалочана 765,3 тыс.тон, у Брэсцкай — 652,8 тыс.тон, у Гомельскай — 535,8 тыс.тон. У Магілёўскай вобласці сабрана больш як 500 тыс.тон, у Віцебскай — 377 тыс.тон збожжа.

Самая высокая ўраджайнасць збожжавых у Гродзенскай вобласці — больш як 36 ц/га. Перасягнулі мінулагодні ўзровень па ўраджайнасці збожжавых гаспадаркі Магілёўскай вобласці — тут збіраюць па 32 ц на круг. Добры ўраджай вырасцілі таксама сельгасарганізацыі Мінскай вобласці — 31 ц/га.



Фота Анатоля КЛЕЦКУКА

Некалькі вялікіх мадэляў колішніх фрэгатаў усталяваны на пляцоўках Шаркаўшчыны. «Святая Алена» ўзвышаецца над ракою Янкай — побач з домам Сяргея Кірылава, які з ахвотаю даглядае своеасаблівы прычал.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ ПА ВЫПЛАЦЕ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ Ў БЕЛАРУСІ ЛІЧЫЦЦА ЗА АДНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла намеснік дырэктара дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ірына Шыляева.

Паводле яе слоў, у Беларусі на 31 ліпеня гэтага года выплачана 99,99 працэнта ад фонду заработнай платы чэрвеня. Ірына Шыляева адзначыла, што агульная сума нявыплачанага заработку складае Br168,5 млн. Увесь гэты аб'ём запазычанасці лічыцца за адным прадпрыемствам — ЗП «Еўранатурпаркет» (Смалявіцкі раён Мінскай вобласці).

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ПАКУЛЬ НЕ ЗНАЙШЛІ ТУРЫСТАК, ЯКІЯ ЗАБЛУДЗІЛІСЯ Ў ЛЯСАХ КАРЭЛІІ

Выратавальнікі пакуль што не выявілі новых слядоў беларускіх турыстак, якія заблудзіліся ў лясах Карэліі, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА кіраўнік мурманскага аддзялення пасольства Беларусі ў Расіі Валерый Новак.

«На гэты момант новых слядоў няма. 31 ліпеня пошукавая каманда на верталёце «прачасала» ўчастак тайгі, але безвынікова. На думку выратавальнікаў, выкарыстанне верталёта малаэфектыўнае з-за вельмі высокіх дрэў у тайзе», — расказаў дыпламат. Акрамя таго, існуюць праблемы з радыёстанцыямі: з трох задзейнічаных у аперацыі на сувязь выходзіць пакуль што толькі адна. Валерый Новак падкрэсліў, што пошукі жанчын не спыняюцца.

Паводле інфармацыі, беларускі прыбылі ў Карэлію ў складзе турыстычнай групы, якая сплаўлялася па рацэ Нюхча. Жанчыны, аддзяліўшыся ад групы, адправіліся збіраць ягады ў лес за 30—35 км ад пасёлка Нюхча Беламорскага раёна і не вярнуліся. Расійскія выратавальнікі вядуць пошукавую аперацыю з 27 ліпеня. У Беламорску створаны аператыўны штаб па пошуку беларусак, якія прапалі. Усе турысткі — мінчанкі.

ТРЫНАЦЦАЦЬ ЧАЛАВЕК ПРЫГАВОРАНЫ ДА ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ ЗА КРАДЗЕЖ ПРАДУКЦЫІ МІНСКАГА МАТОРНАГА ЗАВОДА

Суд Партызанскага раёна горада Мінска вынес прыгавор у адносінах да 14 грамадзян, якія маюць дачыненне да шматлікіх крадзяжоў прадукцыі Мінскага маторнага завода. Па сукупнасці злачынстваў аднаму з удзельнікаў злачыннай групы прызначана пяць гадоў абмежавання волі, астатнім 13 фігурантам справы — ад 3 да 9,5 года пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Як паведаміў журналістам пасля абвяшчэння прысуду выконваючы абавязкі начальніка групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, абвінавачваемыя былі затрыманы ў студзені гэтага года на тэрыторыі завода ў момант крадзяжу 120 масляных картараў да рухавіка. Пасля высветлілася, што некаторыя з затрыманых раней выкралі ў агульнай складанасці 122 махавікі, 35 каленчатых валоў, 69 галовак блокаў цыліндраў. Сума ўрону склала Br100 млн. Паводле слоў Аляксандра Ластоўскага, злачынная група была добра арганізавана, таму зламыснікам доўгі час удавалася пазбягаць выкрыцця. Крадзяжы здзяйсняліся пры садзейнічанні супрацоўнікаў службы аховы прадпрыемства. Скрадзеная прадукцыя збывалася ў Беларусі і Літве. Прыгавор пакуль не ўступіў у сілу ў сувязі з правам асуджаных на яго абскарджанне.

Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.

Калегі

ФОРМУЛА ПОСПЕХУ РЭАЛІСТА ПАЎЛА ЯКУБОВІЧА

Сёння газета «Советская Белоруссия» адзначае 80-гадовы юбілей

Апошняе дзесяцігоддзе гісторыі гэтага ўплывовага штодзённага выдання непасрэдна звязана з імем вядомага журналіста, таленавітага галоўнага рэдактара Паўла ЯКУБОВІЧА — сённяшняга госця «Звязды».

Юбілей «Советской Белоруссии» («СБ») стаў нагодай для падрабязнай размовы пра ўчора-сёння-заўтра ўсёй айчыннай журналістыкі.

— «Советская Белоруссия» пачыналася як газета «Рабочий» у жніўні 1927 года...

— Гэта было вельмі рамантычнае выданне, якое мела нават свой рэдакцыйны вагон — ён прычапляўся да саставаў, якія курсіравалі па ўсіх будоўлях, не абміналі і першыя калгасы, і манеўры Беларускай ваеннай акругі. Газета — у духу тых часоў — была вельмі баявым і дынамічным выданнем. Працавалі ў рэдакцыі цікавыя журналісты — і старыя, яшчэ дарэвалюцыйныя рэпарцёры, і маладыя журналісты, якія прыйшлі з рабфакаў, як гаворыцца, ад плуга, ад станка, з Чырвонай Арміі. Магчыма, ім не хапала літаратурнага бляску, але затое было велізарнае жаданне будаваць, ствараць і фанатычная вера ў тое, што яны робяць святую справу. І сапраўды, газета, асабліва ў глыбінцы, атаясамлівалася з падручнікам жыцця, суразмоўцам, абаронцам.

— У сённяшнім нумары «СБ» (размова адбывалася ў аўторак. — **Рэд.) апублікаваны цікавы матэрыял аб агульнай старонцы ў гісторыі «Звязды» і «Советской Белоруссии».**

— Нашы газеты пэўны час былі адной сям'ёй, і гэта нядзіўна. Нацыянальны архіў удакладніў: 21 верасня 1941 года на базе дзвюх газет, «Звязды» і «Советской Белоруссии» з'явілася новае выданне — беларускамоўная «Совецкая Беларусь»; яе ўзначаліў рэдактар даваеннай «СБ» Іван Фешчанка. Усяго выйшла 126 нумароў газеты, апошні — 8 ліпеня 1944 года ў Гомелі. А ўжо 9 ліпеня 1944 года наша газета выйшла на рускай мове і са знаёмым з даваеннага часу лагатыпам, праўда, захавала фармат і нумарацыю «Совецкай Беларусі», хоць гэта была нумарацыя... даваеннай «Звязды». Толькі ў 1947 годзе «СБ» удакладніла сваю біяграфію: 23 красавіка выйшаў № 82 (8395), а 25 красавіка — № 83 (5023).

У падшыўцы 1944 года беларускамоўная «Совецкая Беларусь» і рускамоўная «Советская Белоруссия» — побач.

Факт надзвычай цікавы: і «Звязда», і «СБ» разам ваявалі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў час Вялікай Айчыннай вайны. «Звязда» была падпольшчыцай, змагалася ў антыфашысцкім падполлі ў Мінску, а потым у партызанскай зоне на востраве Зыслаў на Любаншчыне. Гэта гераічная, легендарная старонка гісторыі — без усялякага перабольшання. А «СБ» ваявала ў складзе рэгулярнай арміі. Яе закідвалі і сюды, за лінію фронту, парашутамі; яна распаўсюджвалася і ў часцях франтоў, якія тады знаходзіліся яшчэ далёка ад Беларусі... Дзве газеты — нібы дзве рукі агульнай патрыятычнай барацьбы з ворагам.

— Яшчэ раз пераконваешся, якая ўнікальная гісторыя нашай Бацькаўшчыны і — нашай прафесіі. Магчыма, наспеў час для стварэння музея гісторыі беларускай журналістыкі? Пачаў выходзіць часопіс «Журналист», прафесійная садружнасць з кожным годам пашыраецца і мацуецца...

— Згодны: з'яўленне часопіса — гэта першая ластаўка, якая сведчыць, што патрэбны новыя формы для таго, каб жывіць і палепшыць нашу прафесійную карпарацыю. Але музей — гэта заўсёды ініцыятыва энтузіястаў (размова ж не пра памяшканне ці адпаведнае ўрадаванае рашэнне!). І такія энтузіясты ў нас ёсць. Мяркую, музей гісторыі беларускай журналістыкі можа атрымацца надзвычай цікавым — прафесія захоўвае шмат геранічных і трагічных старонак, біяграфіі вялікіх талентаў і падзвіжнікаў.

— Павел Ізотавіч, прыемна адзначыць, што і ў «СБ» заўсёды працавалі моцныя, таленавітыя журналісты, якія ў пэўным сэнсе сфарміравалі твар айчыннай журналістыкі, заклалі традыцыі... Якія, на ваш погляд, урокі «СБ» актуальныя для сённяшняй журналістыкі?

— Журналісты, якія працавалі ў «СБ» у тыя — хрэстаматыйныя ўжо — часы, былі людзьмі больш адметна значнымі, і не толькі ў прафесійным вымярэнні. Гэта невыпадкова: за плячамі ў многіх была сур'ёзная біяграфія: у кагосьці фронт ці інтэнсіўнае і складанае пасляваеннае будаўніцтва, вялікая гаспадарчая ці партыйная работа... Незалежна ад таго, каго Гасподзь узнагародзіў талентам у большай ці меншай ступені, гэта былі людзі, здольныя выклікаць цікавасць да свайго погляду на падзеі.

Я часта перагортваю старыя падшыўкі і здзіўляюся, як у часы, якія ў нас традыцыйна называюць «застоем» або «глухой савецкай эпохай», — як скрупулёзна, цікава, самабытна пісалі лепшыя пёры «СБ»! А зараз па розных прычынах журналістыка становіцца... падобная на цяперашні футбол. Раней мінскія балельшчыкі натоўпамі ішлі на стадыён паглядзець, як сёння сыграе той ці іншы футбаліст сваёй каманды, чым адкажа Лабаноўскі з Кіева. У кожнай каманды былі «зоркі» — вельмі адметныя, своеасаблівыя. І гэта рабіла футбол не толькі відовішчным, але і захапляльным спектаклем (дазволю сабе так сказаць), дзе імправізацыі было — як у джазе... Чаму сёння не ходзяць на футбол? Таму што ўсе каманды ў прынцыпе паказваюць аднолькавы ўзровень гульні: усе аднолькава падрыхтаваныя, усе прайшлі адпаведныя футбольныя школы, усе трэніраваліся па адных і тых жа методыках... І зараз гэта ўжо не відовішча, а звычайнае перакочванне мяча... Хоць усе кваліфікаваныя прафесійныя ігракі, выдзеліць нікога немагчыма. Баюся, што і самі яны не імкнуцца выдзеліцца...

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Вольга КОРБУТ:

Рэдкі госць

«ХОЦЬ Я МАЮ АМЕРЫКАНСКАЕ ГРАМАДЗЯНСТВА, ДУША Ў МЯНЕ ЎСЁ РОЎНА ЗАСТАЛАСЯ БЕЛАРУСКАЯ»

Чатырохразовая чэмпіёнка свету па спартыўнай гімнастыцы Вольга Корбут зараз жыве ў ЗША, але не забывае і аб сваёй краіне і родным Гродне. Нягледзячы на вялікую занятасць і сапраўдныя атакі журналістаў, Вольга Валянцінаўна згадзілася адказаць на пытанні карэспандэнта «Звязды». На інтэрв'ю Вольга Корбут прыйшла з сынам Рычардам.

— Калі апошні раз вы наведвалі Беларусь і што вас ўразіла зараз?

Вольга: Я была тут апошні раз пяць ці шэсць гадоў таму, але не афішавала гэта. У мяне практычна ўсе родныя ў Беларусі, таму я прыехала сустрэцца з сынам, яго бацькам і сваімі старэйшымі сёстрамі. З цікавасцю даведалася таксама аб стане беларускай гімнастыкі. Што здзівіла ў Беларусі? Напрыклад, я наведала спартыўны дыспансэр, які калісьці быў маленькім, і пабачыла сапраўдны спартыўны аднаўленчы цэнтр з лепшым абсталяваннем. У Беларусі мяне прыемна здзівілі чысціня і мноства розных новых будынкаў, у тым ліку спартыўных. Мне вельмі спадабалася тут. Яшчэ б добрае надвор'е: я люблю цеплыню і сонца, а надвор'е сапсавалася.

— Як даўно Рычард пераехаў у Беларусь і ці плануеце вы таксама вярнуцца дадому?

В.: Я ніколі не загадваю наперад.

Рычард: Я жыву ўжо два гады ў Мінску. Вярнуўся ў Беларусь па сваёй ініцыятыве, бо радзіма мне падабаецца.

— Чаму вы назвалі сына Рычардам? Мабыць, у гонар акцёра Рычарда Гіра?

В.: Не.

Р.: Мой прадзед па бацькавай лініі быў князь польска-літоўскага княства Рычард I, а я Рычард II. Нават не думаў, што буду жыць у Амерыцы, дзе гэта імя вельмі папулярнае.

— У вас, дарэчы, прозвішча маці ці бацькі Леаніда Бартковіча з ансамбля «Песняры»?

Р.: Бацькі.

В.: Аднак вочы ў яго мае.

— Якія якасці вам перадаліся ад маці?

Р.: Маці ў мяне строгая, калі нешта скажа, то ўсё. У яе вельмі магутная сіла волі, якую я ад яе ўзяў. Дзякуючы маці, я ніколі ў жыцці не ўжываў алкаголь і наркотыкі. Нават ніколі не спрабаваў.

— Сваіх дзяцей будзеце выхоўваць па такой жа сістэме, як і маці?

В.: Напэўна, іх я буду выхоўваць. Мяне, дарэчы, часта пытаюць, якую б я хацела бачыць побач з сынам жонку.

Р.: Я бачу побач толькі беларуску ці расіянку, але ні ў якай меры амерыканку, бо мы занадта розныя.

В.: Я салідарная з сынам: таксама не змагу быць разам з амерыканцам. Магчыма, калі б пераехала ў Амерыку ў дзесяць гадоў, а не калі ўзрост за трыццаць. Я б яшчэ магла жыць з італьянцам ці французам. Пажывём — пабачым.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Фота Вольгі КЛЯЦКУК

СПК «Крошин» Барановичского р-на объявляет тендер

на покупку племенных телок и нетелей черно-пестрой породы с продуктивностью матерей по наивысшей лактации не менее 5,5 тыс. кг молока.

Тендерные предложения принимаются в течение 10 дней со дня опубликования объявления с пометкой «Тендер 2» по адресу: 225362 Брестская обл., Барановичский р-н, д. Крошин, ул. Ленина, 8.

Тел. для справок: 8-0163-43-72-74, 42-40-77 (ф.), 43-72-39 (ф.).

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:

цех шпал пл. 235 кв.м, лесоцех пл. 845 кв.м, по адресу: Логойский район, г.п. Плещеницы. Начальная цена снижена на 20% – 64 237 182 бел. руб. Размер задатка составляет 10% от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 16 августа 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются 15 августа 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» изучает спрос на земельные участки, планируемые к выставлению на аукционы в сентябре 2007 г.

№ п/п	Место расположения и иная информация о земельном участке				
	административный район	в границах улиц	ориентировочная площадь, га	существующие обременения	Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства
1	Центральный	ул. Каховская - ул. Червякова - Смурговский тракт	1,0	усадебная застройка	Жилой дом повышенной комфортности
2	Заводской	ул. Крупская - ул. Малинина – ландшафтно-рекреационная зона вдоль Слепянской водной системы	0,8 - 1,0	автостоянка УП «Гаражи, автостоянки и парковки»	Жилой дом повышенной комфортности с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой
3	Фрунзенский	пер. 2-й Радиаторный, 37	0,3	ветхое нежилое строение	1-2-квартирный малоэтажный жилой дом повышенной комфортности с приквартирным участком
4	Московский	пр. Дзержинского - ул. Коржа - ул. Р. Люксембург	1,0	нежилые строения	Многофункциональный общественный комплекс
5	Советский	пер. 4-й Кольцова	1,7	открытые стоянки автотранспорта (УП «Гаражи, автостоянки и парковки» и др.)	Многофункциональный объект общественного назначения
6	Октябрьский	ул. Бабушкина	0,7	-	Станция технического обслуживания автомобилей с административными и торговыми помещениями
7	Фрунзенский	ул. Шаранговича - ул. Панченко - ул. Академика Федорова	0,8	-	Станция технического обслуживания с административными и торговыми помещениями
8	Первомайский	пр. Независимости - Минская кольцевая автодорога	1,0	-	Гостиница класса 5 звезд
9	Заводской	ул. Бачило, 9	0,03	-	Объект обслуживания населения
10	Партизанский	ул. Солтыса - ул. Ваупшасова	1,2	индивидуальные жилые дома по ул. Таежной № 109 и ул. Солтыса №№ 177, 179	Торговый центр
11	Московский	пр. Дзержинского (район ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк»)	0,40	-	Многоэтажная гараж-стоянка с сервисным центром и помещениями торгового и общественного назначения
12	Центральный	водохранилище «Дрозды» (по пр. Победителей)	0,40	-	Многофункциональный комплекс «Виктория»
13	Центральный	ул. Энгельса - пер. Музыкальный - ул. Интернациональная (1.4.4 – номер участка по ПДП)	0,38	-	Воссоздание восполняемой застройки под объекты общественно-бытового назначения

Пожелания и предложения просьба адресовать по тел. (017) 226-16-72

Попыт расце за кошт... платнікаў?

Зараз паслугі на даму атрымліваюць 77,5 тыс. пенсіянераў і інвалідаў, што прыкладна на 1,8 тыс. чалавек больш, чым яшчэ ў пачатку года — аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Як заўважыла галоўны спецыяліст упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Яніна Ладышава, рост паказчыкаў абслугоўвання на даму можна патлумачыць павелічэннем колькасці населеных пунктаў, дзе працуюць сацыяльныя работнікі. У прыватнасці, сёння абслугоўваннем на даму ахоплена 53 працэнты вёсак краіны, прычым, як чакаецца, гэта лічба стане большай ужо да канца года.

Дарэчы, апошнім часам у краіне змяншаецца доля пенсіянераў і інвалідаў, якія атрымліваюць паслугі на даму бясплатна, і павышаецца ўдзельная вага грамадзян, якія карыстаюцца паслугамі сацыяльных работнікаў на ўмовах поўнай або частковай аплаты. Такі малюнак, мяркуе Яніна Ладышава, перш-наперш тлумачыцца даступнасцю тарыфаў. Так, традыцыйна найбольш папулярнае абслугоўванне на даму з 50-працэнтнай скідкай зараз у залежнасці ад рэгіёну абыходзіцца ад 7,5 да 14,5 тыс. рублёў у месяц.

Сяргей ГРЫБ.

ISSN 1990 - 763X

«...ДУША Ў МЯНЕ ЎСЁ РОЎНА ЗАСТАЛАСЯ БЕЛАРУСКАЯ»

Фота з архіва прэс-службы НАК.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

— Цяжка быць сынам такіх знакамітых бацькоў?

Р.: Канешне, іх ведаюць, але мне гэта не цяжка, я вельмі ўдзячны бацькам, што шмат чаго пабачыў, лятаючы з імі.

В.: Ён знаёмы і з Арнольдам Шварцэнегерам.

Р.: Першае інтэрв'ю ў маці брала яго жонка, калі мы толькі пераехалі.

В.: Яна вельмі цікавілася тэмай Чарнобыля. Дарэчы, Чарнобыльская праблема была адной з прычын, чаму мы пераехалі ў ЗША. Я займалася фондам дапамогі дзецям Чарнобыля і шмат ездзіла, прывозіла лекі. Так склалася, што мне прапанавалі працу ў Амерыцы.

— У Амерыцы вы ўсё яшчэ трэніруеце амерыканскіх гімнастак?

В.: Я ніколі не працую, а займаюся сваёй любімай справай. Я распрацавала сваю праграму фітнэса. Трэнірую ў танцавальнай студыі, дзе выкладаю аснову гімнастыкі — гэта і танцы, і балет.

— Чаму вы не адкрыеце сваю школу гімнастыкі?

В.: Я не магу мець яе, бо не здолею ёй кіраваць. Бізнэс не для мяне, а вось сын можа стаць цудоўным бізнэсменам у будучым.

— Што патрэбна, каб вы сталі працаваць з беларускімі спартсменамі?

В.: Многае залежыць ад мяне. Канешне, я працавала б тут, бо ў Беларусі мне ўсё роднае, але пакуль тут недастатковыя ўмовы для трэніровак. Павінны быць цэлы гімнастычны цэнтр з памяшканнямі для масажу, аднаўлення і г. д.

— У вас амерыканскае грамадзянства, а ці адчуваеце сябе ў Амерыцы сваёй?

В.: Пражыўшы ў ЗША 16 гадоў, канешне, ужо не адчуваеш там сябе госцем. Аднак я ўсюды адчуваю сябе камфортна — у Англіі, Аўстраліі. І ўсё ж душа ў мяне засталася беларуская. Я тут, каб легальна зрабіць дакументы і ездзіць у Беларусь часцей: я ж беларуска, бо тут нарадзілася і выраслa. Гэта мая радзіма.

— Вольга Валянцінаўна, вы рады, што сын не пайшоў па вашых спартыўных кроках?

В.: Чаму ж? Ён у мяне спартыўны. Займаўся тэнісам, баскетболам і ў маёй групе чатыры гады. Калі вы папросіце, ён імгненна зробіць сальта. Рычард вельмі развіты фізічна.

Р.: Спорт вельмі дысцыплінуе. Я лічу, што кожны чалавек павінен займацца спортам. Хацеў бы стаць алімпійскім чэмпіёнам, як маці, але для гімнастыкі я занадта высокі.

В.: Не кожнаму дадзена прайсці праз гэтую пякельную працу, бо калі становішся на прыступку вялікага спорту, гэта ўжо не надта вялікае задавальненне. Спачатку я не магла жыць без гімнастыкі. Потым яна была патрэбная, бо я абараняла гонар краіны.

— Сяброўак у вас зараз больш у Амерыцы ці ў Беларусі?

В.: Не думаю, што магчыма сябраваць з іншымі душамі: у мяне многа знаёмых у Амерыцы, але добрая сяброўка толькі адна — з Мінска.

— На якія тэмы вы любіце весці размовы з ёй?

В.: Як усе жанчыны мы размаўляем аб касметыцы, упрыгажэннях. У мяне, дарэчы, да гэтага вялікая слабасць. Першае, куды я пайшла, калі прыехала, быў магазін упрыгажэнняў, каб заказаць сабе нешта.

— На якой мове размаўляеце з сяброўкай?

В.: Гутарым па-руску. Магчыма, я і захавала яе для гэтага. Яшчэ гутару па-руску са сваёй кошкай (*усміхаецца*), а таксама з Рычардам, роднымі.

— У ЗША вы жывяце ў асобным доме?

В.: Не. Зараз я жыву ў кватэры ў Арызоне, самым спякотным штаце ЗША. Калі ў Мінску сапсавалася надвор'е, у мяне зашчыміла сэрца: хачу паехаць пагрэцца ў Арызону. У Атланце ў нас быў вельмі вялікі дом, а пераехалі мы адтуль таму, што я вельмі стамлялася, бо ніколі нікому нічога не давяраю рабіць. Калі нешта раблю, то раблю ўсё. У мяне на гэта дастаткова часу.

— Вы прыйшлі на інтэрв'ю ў кепцы. Любіце спартыўны стыль?

В.: Гэта кепка Анджэліны Джолі. Мне пададабаюцца дызайнерскія рэчы, але мне не хочацца шмат часу губляць на шопінг, бо спецыяльна трэба ляцець у Лос-Анджэлес, а прыйсці ў бліжэйшы магазін і нешта набыць сабе — нерэальна. Мабыць, толькі абутак.

Р.: Матулі цяжка знайсці сабе патрэбнае адзенне з-за невялікага росту. Яна ездзіць адпачываць на Гавайскія астравы, а там большасць тавараў з Японіі. Японцы таксама маленькія, таму маме ўсё там падыходзіць.

— Зараз сярод знакамітасцяў вельмі модна распрацоўваць сваю лінію адзення. Магчыма, гэта быў бы варыянт, каб стварацца мадэлі і на сябе, і на жанчын з такой жа камплекцыяй?

В.: Гэта не маё. Губляецца шмат часу, а ён для мяне вельмі дарагі.

— Амерыканцы больш святкуюць Каляды, чым Новы год. Якое з гэтых святаў для вас на першым месцы?

В.: Новы год. Не, пачынаем мы з Каляд, а заканчваем Новым годам.

— Святкуеце яго з роднымі?

В.: Я ў асноўным запрашаю сваіх родных на аксамітны сезон, калі ў школе канікулы і можна з'ездзіць адпачыць у Каліфорнію.

— Значыць, вы любіце вандраваць?

В.: Не, таму я і запрашаю ўсіх да сябе ў госці. Гэта паездка ў Беларусь мне даецца цяжка, бо дзесяць гадзін розніцы мяне стамляюць. Два тыдні ідзе на адаптацыю. Вада іншая, ежа іншая — ежа смачнейшая.

— Якія стравы гатуеце дома?

В.: Плоў, дранікі з мясам, але мой рацыён у асноўным складаюць салата, садавіна і гародніна. Мне падабаецца нешта выдумляць і ствараць свае стравы.

— За каго вы «хварэеце» на Алімпійскіх гульнях — амерыканцаў ці беларусаў?

В.: Апошні час я перастала «хварэць» за кагосьці, бо не бачу там сваіх спартсменаў. Хацелася б, каб Беларусь як гімнастычная дзяржава заяўляла б аб сабе. У нас жа вельмі таленавітыя дзеці, але з'язджаюць трэнеры з-за невялікай аплаты. Акрамя таго, з гімнастыкі сыходзяць у іншыя віды спорту, бо яна як аснова для падрыхтоўкі.

— Як вы ставіцеся да допінгавай праблемы? Штогод у Беларусі і ў іншых краінах дыскваліфікуюць спартсменаў з-за ўжывання забароненых рэчываў...

В.: Я не ведаю, як у іншых відах спорту, але ў гімнастыцы ўжываць допінг нельга, бо псуецца імунная сістэма і каардынацыя. Я не думаю, што калісьці ў гімнастаў знаходзілі допінг. Магчыма, толькі ў тых відах спорту, дзе трэба хутчэй бегаць. Канешне ж, я не вітаю ўжыванне допінгу, бо гэта дрэнна для здароўя.

— Застаецца роўна год да старту летніх Алімпійскіх гульняў у Пекіне. Якія б парады вы далі беларускім спартсменам?

В.: Шмат працаваць. Год — гэта не так многа, але калі б быў добры трэнер, як я, то можна было б зрабіць шмат: даць спакой і ўпэўненасць, маю ўсмешку, дапамагчы пазбыцца сябе, смела абараняць сваю краіну, калі выходзіш на памост. Гімнасты ж — і акцёры, і палітыкі.

— Дзе зараз вашы алімпійскія медалі?

В.: Адзін у мяне з сабой, які я забрала з Гродна. Астатнія ў Арызоне.

— Існуе катэгорыя людзей, якія на інтэрв'ю ніколі не будуць расказваць аб асабістым жыцці. На якія пытанні вы ніколі не станеце адказваць?

В.: Я даволі адкрыты чалавек. Нават калі вы не спытаецеся, я магу сказаць многае сама. Калі чытачы цікавяцца, чаму не падзяліцца з імі інфармацыяй? Вось чаго я не люблю — гэта плётак, калі нехта недачуў і перадаў далей.

— Ці часта ў вас пытаюцца, па якой прычыне вы разышліся з мужам?

В.: Пытаюцца. Прычына разводу — ён павінен быць на сцэне. У Амерыцы муж, канешне, спяваў, але ён не амерыканец і таму вярнуўся дадому.

— Вы падтрымліваеце сяброўскія адносіны?

В.: Так. Яны з сынам мяне разам сустракалі, калі я прыляцела ў Беларусь, толькі што гутарылі па тэлефоне. Калі людзі разыходзяцца і не застаюцца сябрамі, гэта не рэзонна.

— Рычарду дастаўся ў спадчыну голас бацькі?

Р.: Я не творчы чалавек. Больш мяне захапляе бізнэс. Аднак у цэлым я яшчэ не вызначыўся з жыццёвым шляхам.

— Колькі ж вам гадоў, калі вы яшчэ «на ростанях»?

Р.: 28.

В.: Канешне, гэта ўзрост, калі ўжо можна было б вызначыцца, але лепей весці нейкую справу і заўжды знаходзіцца ў пошуку. Як я: была ў гімнастыцы, а зараз у фітнэсе, але гэта — таксама своеасаблівая гімнастыка. Жыццё само падказвае, што рабіць далей. Калі яго падштурхнеш, то можаш і спужаць. Трэба быць спакойным і ісці наперад.

— Амерыканцы ў асноўным людзі паўнаватыя. Як вам удаецца заставацца мініяцюрнай, трымаць сябе ў форме?

В.: У мяне ёсць свой комплекс практыкаванняў. Не для таго, каб пахудзець, а каб пазнаваць і любіць сябе. Акрамя фізічных практыкаванняў, трэба правільна харчавацца: есці толькі такія прадукты, якія дапамагаюць жыць, якія не змяшчаюць шкодных рэчываў. Я вельмі сачу за сваім здароўем. Не так даўно прайшла поўны медагляд і магу зноў ісці на бервяно, бо ў мяне ўсё ў парадку.

— У вас ёсць свой рэцэпт прыгажосці?

В.: Я не карыстаюся мылам. Толькі раблю маскі. Я шмат працую над сабой. Мы, жанчыны, павінны мець так званы «мой час» — прысвячаць сабе гадзіны 2—3 у дзень на маскі, масажы.

Ірына ПРЫМАК.

Выпрабавана на сабе

«ЗАПЧАСТКІ НЕ МЯНЯЦЬ!»

— Алё, дзень добры! Гэта зноў я, наконт абмену! Скажыце, калі ласка, ці будзеце вы сёння працаваць?

Гэтае пытанне за апошні месяц я паўтарыла незлічоную колькасць разоў. А справа ўся ў тым, што ў мяне зламалася... Назавём гэта запчасткай для майго ноутбука. Дзе я набыла гэтую запчастку — таксама казаць не буду, каб не зрабіць антырэкламы і нікога не пакрыўдзіць. Назавём гэта месца проста — гандлёвы пункт. Дадам толькі, што пункт гэты камерцыйны.

— А, гэта вы! — пазнаў мяне прадавец (хай ён будзе, напрыклад, Вадзімам). — Мы сёння ўжо працуем, прыязджайце. Дзеля вашага выпадку нават наш адміністратар прыйшоў...

Я ацаніла ўвагу. Узяла заключэнне з рамонтнай майстэрні, дзе было напісана, што запчастка рамонту не падлягае. З гэтым заключэннем я прыехала ў той гандлёвы пункт. Аднак увага да майго «выпадку» (так назваў мае законныя патрабаванні адміністратар Міхась), відаць, не пасябравала з павагай да маёй асобы.

— Зараз мы паглядзім, ці сапраўдная гэтая паперка, — адміністратар задумліва разглядаў пячатку. Нават на сонца праз яе паглядзеў. Потым запатрабаваў гарантыю, якую таксама доўга разглядаў. Уважліва агледзеў каробку з-пад запчасткі...

Я ведаю, што па Закону аб абароне правоў спажыўца захоўваць упакоўку не абавязкова. Я павінна прынесці толькі дакумент, дзе ёсць звесткі аб назве тавару, яго кошту, звестках аб прадаўцу (арт. 1).

— Добра, зараз паглядзім, што я магу для вас зрабіць, — буркнуў Міхась, выходзячы за дзверы. На парозе спыніўся, пахмурна паглядзеў на мяне і дадаў: — Вадзім, прыгледзь за таварам...

Выдатна! Мяне амаль што махляркай назвалі! Я здзіўлена паглядзела на прадаўца. Той паціснуў плячыма.

Міхась вярнуўся праз колькі хвілін.

— Вось, я прынёс запчастку з тымі ж характарыстыкамі, але крыху іншай мадэлі. Яна каштуе столькі ж, колькі і ваша. Нават па дакументах можаце паглядзець...

У тых радках, якія ён мне паказваў у дакументе, кошт дзвюх мадэляў супадаў. Шчыра кажучы, я не памятала дакладна нумар мадэлі маёй запчасткі, але аддала за яе паўгода таму амаль у два разы больш, чым было напісана ў дакументе. Гэта я памятала дакладна. Каб не заблытацца і не разгубіцца, я адсунула паперку з лічбамі і пачала гаварыць словамі — такая мова больш зразумелая для мяне.

Я патлумачыла, што па некаторых якасцях мне гэтая запчастка не падабаецца і не падыходзіць.

Увага! Па закону, калі набытая мною рэч падчас гарантыйнага тэрміну зламалася, я маю права на бясплатны рамонт. Акрамя таго, калі рэч рамонту не падлягае (зразумела, не з маёй дапамогай), прадавец павінен замяніць яе на такую ж па цане ці вярнуць мне грошы.

— Тады мы возьмем запчастку на рамонт, — адміністратар пачаў злавацца. — Праз тыдзень-другі прыходзьце.

— Ведаеце, я без гэтай запчасткі як без рук. І мне яна патрэбная ўжо сёння. Тым больш што ў заключэнні напісана...

— Я вам прапанаваў варыянты. У вашым выпадку іх два. Мы ўсё робім па закону, — Міхась глядзеў на мяне праз сонечныя акуляры, раздражнёна стукаючы пальцамі па сталу, каля якога мы стаялі.

Вось дарэмна ён пра закон успомніў. Так, два тыдні на рамонт запчасткі ў яго ёсць (п. 1 арт. 21). Таксама ён мае права месяц шукаць запчастку аднолькавай мадэлі, з аднолькавымі паказчыкамі... Калі не знойдзе — верне грошы ці прапануе запчастку з падобнымі характарыстыкамі. На час гэтых пошукаў прадавец павінен даць спажыўцу, мне, у часовае карыстанне такую ж па функцыях рэч. (п.1, 2 арт. 22). Але, па сутнасці, які з гэтых варыянтаў выбраць (рамонт, замена, грошы) — вырашаю я. Гледзячы на спробы мяне ашукаць, я папрасіла вярнуць грошы.

— А што мне потым з гэтай жалезкай рабіць? — абураўся адміністратар. Вадзім паспрабаваў нешта прапанаваць, аднак Міхась папрасіў яго «пагуляць». — Яна страціла свой пачатковы выгляд, вы карысталіся ёй амаль паўгода. Нават адрамантаваную я ўжо не змагу запчастку гэту прадаць.

І зноў памылка! Ведаю я арт. 25 Закона аб абароне правоў спажыўца. У ім сказана, што пералік кошту тавару пры звароце не робіцца. І не мае значэння, колькі я карысталася запчасткай і што яна згубіла свой таварны выгляд. За гэта прадавец грошы з мяне браць не павінен.

Калі Міхась зразумеў, што такія гульні са мной не пройдуць, разлавaўся моцна. Выскачыў з пакою, пабег некуды — пытацца пра магчымасць своечасовага рамонту. Аднак хутка вярнуўся і прынёс мне грошы. Не люблю, калі людзі не здымаюць сонечныя акуляры падчас размовы...

Вадзім, пакуль адміністратар хадзіў па грошы, прапанаваў набыць патрэбную мне новую запчастку ў суседнім гандлёвым пункце.

— Не ведаю, чаму Міхась не знайшоў такую ж, як ваша, запчастку. Яны яшчэ павінны быць...

Атрымаўшы свае тысячы (паверце, зусім не малыя), я выйшла з пакою, развітаўшыся з адміністратарам. Ён мне не адказаў. Аднак, калі ўслед выйшаў Вадзім, Міхась строга вымавіў:

— Запчасткі не прапаноўваць!

Напэўна, пакрыўдзіла я адміністратара нечым. Мабыць, тым, што ведала свае правы і абавязкі?

Настасся КАРАЦЕЕВА.

ЛАГОЙСКАЯ ЗБАЖЫНА

Беларусь актыўна вядзе жніво. У Мінскай вобласці самы цяжкі раён — пагоркавая Лагойшчына: ад механізатараў тут патрабуецца асаблівае майстэрства. Ускладняе сітуацыю і дажджлівае надвор'е.

НА ЗДЫМКАХ: апрацоўка збожжа ў сельскагаспадарчым цэнтры «Гайна» вядзецца па навейшай тэхналогіі: збожжа праходзіць цыкл плюшчэння.

Адна з самых лепшых брыгад сельскагаспадарчай фермы «Спадарожнік» — камбайнер Уладзімір МІГУЛЬКА з памочнікам Валерыем ВАНЗОНКАМ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У МІНСКУ ЎЗРОВЕНЬ ХАЛЕСТЭРЫНУ МОЖНА БУДЗЕ ЗМЕРАЦЬ У БУЙНЫХ УНІВЕРМАГАХ

Як расказаў сёння на сустрэчы з журналістамі ў Мінску дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Ігар Адзярыха, з гэтай мэтай распрацавана спецыяльная праграма, якая прадугледжвае закупку рэагентаў для абсталявання па вызначэнню ўзроўню халестэрыну.

Плануецца, што пункты па вымярэнню ўзроўню халестэрыну па прыкладу пунктаў па вымярэнню артэрыяльнага ціску размесцяцца на базе буйных гандлёвых прадпрыемстваў сталіцы. Аднак пакуль не вырашана, ці будзе гэта працэдура бясплатнай. «У бліжэйшы час мы сустрэнемся з кіраўніцтвам горада і будзем думаць і гаварыць аб як мага больш шырокім ахопе ўзроўню халестэрыну», — дадаў спецыяліст. Ігар Адзярыха адзначыў, што павышаны ўзровень халестэрыну ў крыві з'яўляецца адзіным з фактараў рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў. У цяперашні час медыкі ўсяго свету спрачаюцца аб тым, якое ўтрыманне халестэрыну з'яўляецца аптымальным. Беларускія спецыялісты лічаць, што яно не павінна перавышаць 5,2 мілімоля на літр. Разам з тым недахоп халестэрыну не менш небяспечны. З гэтага біяхімічнага рэчыва сінтэзуюцца ўсе гармоны, яно з'яўляецца кампанентам клетачных мембран. «Калі ўзровень халестэрыну зніжаецца, таксама ўзнікае шмат праблем», — рэзюмаваў дырэктар РНПЦ «Кардыялогія».

Марыя ГУЦАЛА, БЕЛТА.

САМЫ ВАЛАСАТЫ ЧАЛАВЕК У СВЕЦЕ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ПРАВА НЕСЦІ АЛІМПІЙСКІ ФАКЕЛ

Рэкардсмен Кнігі рэкордаў Гінэса, кітайскі спявак Юй Чжэнхуань, які пакутуе ад залішняга росту валасоў, хоча стаць удзельнікам эстафеты алімпійскага агню да Гульняў-2008 у Пекіне.

Спявак пакутуе ад гіпертрыкозу — валасы пакрываюць 96 працэнтаў паверхні яго скуры. Урачы называюць гэты стан атавізмам. Некаторы час таму ён з-за частковай страты слыху вымушаны быў зрабіць аперацыю па выдаленню валасоў з вушэй. «Я ўсё роўна буду спяваць, — сказаў тады Чжэнхуань. — Рок-н-рол дадае мне жыццёвага аптымізму і робіць бліжэй да людзей». Юй Чжэнхуань хоча несці алімпійскі агонь, каб даказаць, што Гульні аб'ядноўваюць усіх людзей у свеце, у тым ліку тых, хто пакутуе ад падобных анамальных адхіленняў у будове арганізма.

БЕЛТА—Сіньхуа.

Вы і не здагадваліся

У 90 працэнтах выпадкаў патолагаанатамы працуюць з жывымі людзьмі

Некаторыя крыніцы сцвярджаюць, што першыя ўскрыцці трупаў былі зафіксаваны ў старажытных дакументах ужо ў XIII стагоддзі. У XV стагоддзі было праведзена пасмяротнае даследаванне цела папы рымскага Аляксандра V, таму што «афіцыйныя» прычыны смерці выклікалі сумненні. Аперацыі праводзіліся з судова-медыцынскай мэтай. Аднак з-за рэлігійных і бытавых умоў паталагічная анатомія доўгі час не магла развівацца. Толькі ў XVIII стагоддзі даследаванні Дж. Марганьі і М. Ф. К. Біша далі пачатак гэтай галіны медыцыны як самастойнай дысцыпліны. Хутка з'явіліся атласы і дапаможнікі.

Сёння паталагічная анатомія пайшла значна далей. Патолагаанатамы часцей працуюць з жывымі тканкамі. Некаторыя захворванні, так званыя паталогіі, цяжка ці немагчыма вызначыць ніякім іншым спосабам, па звычайных аналізах. Пры дапамозе гэтай галіны медыцыны ў цяжкіх выпадках ставяцца выніковыя дыягназы.

Дакладнасць дыягназу пры паталагічнай анатоміі амаль 100 працэнтаў.

Асноўныя метады, якія выкарыстоўваюць патолагаанатамы пры дыягностыцы — біяпсія і аўтапсія. Біяпсія — гэта прыжыццёвае даследаванне кавалачка тканкі ці органа з дыягнастычнай мэтай. Пасмяротнае ўскрыццё і даследаванне цела і органаў — гэта аўтапсія (першапачатковая адзіны метад паталагічнай анатоміі). Пры дапамозе біяпсіі можна вызначыць усе вядомыя захворванні. Тым больш што развіццё медыцынскай тэхнікі дазваляе атрымаць тканкі для даследавання амаль з усіх органаў чалавечага цела.

Патолагаанатамы — людзі вясёлыя. Мабыць, нейкіх прафесійных жартаў у прадстаўнікоў гэтай прафесіі і няма, аднак абвостранае пачуццё каштоўнасці жыцця прысутнічае заўсёды, заверыў мяне начальнік Мінскага патолагаанатамічнага бюро Аркадзь Фёдаравіч Пучкоў.

— Тыя, хто выбраў нашу прафесію, спачатку баяцца — праца ўсё ж спецыфічная. Аднак праз тыдзень гэты страх праходзіць. Праз месяц становіцца цікава... Каб стаць добрым патолагаанатамам, трэба перастуліць псіхалагічны бар'ер. Наша прафесія — гэта не толькі работа, гэта яшчэ і прызванне. Бачыць кожны дзень смерць — і ад гэтага ўсё больш любіць жыццё. У кожнай зале, дзе праводзяць анатаміраванне, ва ўсіх краінах свету ёсць надпіс: «Тут мёртвыя вучаць жывых»...

Прадузятае стаўленне да паталагічнай анатоміі захаваліся да нашага часу. Абурэнне супраць аўтапсіі было пераважна з боку малаадукаванай часткі насельніцтва. І сёння з насцярожанасцю ставяцца да прадстаўнікоў гэтай прафесіі. Аднак патолагаанатамаў менш не становіцца. Калі чалавек паступае ў медуніверсітэт, ён, можа, і не ведае, спецыялістам якой галіны хоча быць. Аднак падчас навучання ўжо можа параўнаць і выбраць, што яму больш цікава — рабіць прыгожыя зубы, слухаць сэрца ці шукаць паталагічныя адхіленні.

У 90 працэнтах выпадкаў патолагаанатамы працуюць з жывымі людзьмі...

Настасся КАРАЦЕЕВА.



Запросіны

ЯК ЛАСІХА ДЫЛІЖАНС ДАГАНЯЛА

Паркавая зона «Каробчыцы», якая створана непадалёк ад абласнога цэнтра па ініцыятыве дырэктара Гродзенскага мясакамбіната Анатоля Грышука, займае 16,5 гектара. На сёння тут не ў вальерах, а абсалютна свабодна (тэрыторыя мае толькі знешнюю агароджу) ходзяць дзесяць аленяў, дзевяць дзікоў і адна ласіха. А побач з імі свой другі дом знайшлі дзесяткі іншых жывёлін і птушак, у тым ліку для Беларусі экзатычных.



А спачатку яе загадчык Станіслаў Ядкоўскі і начальнік рамонтна-будаўнічага ўпраўлення мясакамбіната Валерый Бурдук азнаёмілі нас з некаторымі праектамі, якія тут ажыццяўляюцца (усё будуецца з нашым нацыянальным каларытам, пад даўніну), пасля чаго мы пабывалі ў стайні конна-спартыўнага клуба «Амадэус». На сёння тут жывуць 26 коней, у асноўным беларускіх парод, але ёсць і «іншаземцы».

— Вось такіх кабылак у Беларусі толькі дзве, — расказвае Станіслаў Станіслававіч. — Гэта падарунак міністра сельскай гаспадаркі Германіі нашай стайні. Коні гэтай пароды былі спецыяльна выведзеныя для кантакту з дзецьмі — як бачыце, невялікага росту, а па характару спакойныя, дружалюбныя. А, бадай, самыя запатрабаваныя сярод дзетак вось гэтыя поні Артыст і Чалік. Цяжка складваўся іх лёс. Не буду казаць, дзе яны раней пражывалі, але там пра гэтых конікаў наогул забылі. Мы забіралі іх у паўсвядомым стане пасля таго, як поні прастаялі ледзь не ўсю зіму ў разбураным хляве і з'елі там усё, што было прыдатнае да ежы. Цяпер яны жывуць і працуюць у нас. Па характару Артыст і Чалік не надта памяркоўныя (маўляў, не чапляйцеся да мяне), але не было выпадку, каб яны кагосьці нечым пакрыўдзілі... Спадзяёмся, што ўсё добра будзе і ў Пілігрыма, які толькі што прыехаў з адной гаспадаркі, дзе два гады прастаяў у стайні без якога-небудзь занятку. На жаль, час для выхавання ўпушчаны, але паспрабуем і яго заездзіць. А ці бачылі вы коней з такой проста ўнікальнай афарбоўкай, як у Бліка? Накшталт рэкламы «Мальбара» на рэкламных шчытах... У гаспадарцы, дзе гэты прыгажун раней знаходзіўся, ужо на ім, як кажуць, крыж паставілі — былі вельмі хворыя ногі. Падлячылі, і цяпер Блік выдатна працуе ў пракаце. Дарэчы, жадаючых зрабіць конную прагулку на дыліжансе па нашай паркавай зоне, асабліва ў суботу і нядзелю, столькі, што ледзь паспяваем усіх абслужыць. Коні тады працуюць па чарзе, зробяць па тры кругі — мяняюцца.

Станіслаў Ядкоўскі так падрабязна расказвае пра пароды коней і іх асаблівасці, што нагадвае сапраўднага прафесіянала з адукацыяй па конегадоўлі. Але, аказваецца, у яго дыплом спецыяліста па эканоміцы і знешняму гандлю. А коней, кажа, проста любіць. Як і член клуба «Амадэус» Ксюша Зленка. «Яны ж дабрэйшыя за многіх людзей», — лічыць дзяўчына і літаральна ўвесь свой вольны час аддае догляду коней. Улічана нават такая «дробязь», як замацаваныя на столі стайні хвойныя галінкі — гэта натуральны антысептык, менш мух і бактэрый.

Дарэчы, членамі конна-спартыўнага клуба «Амадэус» могуць стаць не толькі дзеці работнікаў Гродзенскага мясакамбіната, а ўсе жадаючыя. У перспектыве побач са стайняй мяркуюць пабудаваць крыты манеж для спаборніцтваў па канкуру. Цікава, што пакоі для іх удзельнікаў прадугледжаны на другім паверсе ... стайні — з драўлянымі ложкамі, сеннікамі. І гэта невыпадкова.

— Ноч перад спаборніцтвамі трэба правесці ў адным памяшканні з коньмі, — тлумачыць Станіслаў Ядкоўскі.

І, канешне, дзе коні — там і карэтам прымяненне знойдзецца. Адна з іх, да прыкладу, некалі была задзейнічана ў здымках фільма, а затым, як коні, аказалася нікому не патрэбнай, нават без колаў. Цяпер жа, пасля рэстаўрацыі, гэта, можна сказаць, элітны транспартны сродак, які ўдзельнічае ў вясельных картэжах.

...Выходзім са стайні на вуліцу, а там нас ужо чакае шыкоўны дыліжанс, якім будзе кіраваць фурман Аляксандр Хлістоўскі, жыхар вёскі Луцкаўляны. Сёння ў дыліжанс запрэжаны прадстаўнік знакамітай фрыскай пароды: гэтых коней мне цыганскай кібіткі. А па суседству — домік Бабы Ягі. Выканаўцу яе ролі на работу яшчэ не ўзялі, але адна бабуля ўжо прыязджала. Вазьміце, кажа, мяне, буду сядзець ля акенца і дзетак пужаць.

— А там, — паказвае на лясны масіў Станіслаў Ядкоўскі, — зона спакою. Там толькі жывёла, мы туды не ходзім, хіба што крыху падкошваем. Стараемся не парушыць натуральныя ўмовы для пражывання жывёлы. Скажам, расце крапіва — значыць, і павінна расці.

Далей мы бачым... афрыканскіх страусаў. Маладыя, быццам і не павінны яшчэ несціся, аднак паколькі ўтрыманне добрае, кармоў хапае, то ўжо даюць яйкі. А ў куце вальера ляжаў горны грывісты баран — схаваўся, толькі рогі былі бачныя. Але, пэўна, самае цікавае нас чакала наперадзе.

— Вунь каля агароджы алені стаяць, а побач — ласіха, — звяртае нашу ўвагу на прыкладна двухсотметровую адлегласць Станіслаў Ядкоўскі. — Паглядзіце, як яна за намі пойдзе.

І сапраўды, як толькі наш экіпаж наблізіўся да ласіхі, яна зусім не кінулася наўцёкі, а наадварот, стала бегчы за дыліжансам. Пагоня атрымалася хоць і нядоўгай, але даволі захапляльнай. На думку Станіслава Ядкоўскага, тут магчымыя дзве прычыны. Першая — ласіха прызвычаілася, што на калёсах з коньмі развозяць кармы. І другая — сумнавата адной... Аднак лася ў пару да ласіхі завесці пакуль не рызыкуюць: усё ж такі гэта вялізная жывёліна і невядома, чаго ад яе можна чакаць, агароджа па вышыні спатрэбіцца як мінімум чатырохметровая.

Хоць і значна менш габарытныя жывёлы і птушкі (а гэта маралы, козы, казулі, трусы, фазаны, паўліны, куры, гусі, індыкі...) таксама патрабуюць пастаяннага клопату, найперш, зразумела, што датычыцца ўмоў пражывання і рацыёну. Гэтак жа як і карп, белы амур, таўсталобік, фарэль, асетр і іншыя віды рыбы ў матачным возеры, дзе гадуюцца будучыя насельнікі для іншага, вялікага вадаёма.

...Напрыканцы нам пашанцавала ўбачыць яшчэ адзін «казырны» нумар: з лесу на адлегласць некалькіх дзесяткаў метраў ад дыліжанса выйшаў адзін з дзевяці тутэйшых дзікоў. Станіслаў Ядкоўскі падышоў і пагладзіў яго, быццам хатняга ката. Мусіць, і сапраўды ўмовы тут такія, што адбываецца гарманічнае яднанне чалавека з прыродай.

Дарэчы, у адным з невялікіх вадаёмаў мы ўбачылі белы гарлачык, які абы дзе не расце. Значыць, аўра добрая ў гэтых мясцінах.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.
Гродзенскі раён.





ФОРМУЛА ПОСПЕХУ РЭАЛІСТА ПАЎЛА ЯКУБОВІЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Калі правільна вас зразумела, гэта пэўны знак часу: «Раньше были времена, а теперь — минутки»?..

— Я хачу сказаць, што самая вялікая небяспека для любога творчага чалавека (у футболе, журналістыцы, балеце і г.д.) — небяспека ўніфікаванасці. Нівелюецца сама прырода творчасці: свайго роду «асобасны глабалізм»... Журналісты прыходзяць у рэдакцыі газет, радыё, тэлебачання — часта пры ўсім жаданні немагчыма ўбачыць чалавека, які мае ўласнае «я». Ва ўсіх амаль аднолькавыя біяграфіі, амаль ва ўсіх аднолькавыя адчуванні, ацэнкі жыцця... І таму сёння складана чакаць, што з'явіцца новы Аграновіскі ці ўнікальныя пёры «СБ», пра якія мы гаварылі.

— Павел Ізотавіч, вы песіміст? Альбо, як у тым жартоўным афарызме, «песіміст — гэта добра інфармаваны аптыміст»?..

— Я рэаліст. Бо працую з журналістамі. Мне даводзіцца — па прычыне пасады — чакаць ад іх чагосьці арыгінальнага, самабытнага, цікавага. Але падстаў для радасці ў гэтым сэнсе малавата. Будзем спадзявацца, што паступова колькасць перарасце ў якасць.

— Газета «Рабочий» выйшла ў перыяд індустрыялізацыі, першапачатковая канцэпцыя была адпаведная. А праз 80 гадоў, у пачатку XXI стагоддзя, як бы вы абазначылі канцэптуальнае крэда «СБ»?

— Яно выражана ў нашым слогане: «Беларусь сегодня». Гэта і індустрыялізацыя, і электрыфікацыя, і культурная рэвалюцыя, і яшчэ сто тысяч з'яў, якія складаюць тканіну жыцця. Мы пішам аб усім і, спадзяюся, у нас будзе прыбаўляцца чытачоў — у першую чаргу не тых, якіх нам дадае «адміністрацыйны рэсурс» праз ведамасную падпіску на газету; для нас больш важна, калі людзі падпісваюцца самі або шукаюць выданне ў кіёсках.

Для гэтага газета павінна быць па-сапраўднаму «рынкавай», г.зн. канкурыраваць у тым ліку з газетамі, якія ставяць перад сабой крыху іншыя задачы. Наша мэта — інфармацыя, каментарыі, уплыў. А ёсць газеты, што ставяць на мэце толькі атрыманне прыбытку, — таблоіды, што не саромеюцца ні ў выразах, ні ў прыёмах, ні ў формах падачы інфармацыі. Але паколькі яны ляжаць побач на адной паліцы ў кіёсках, то нам трэба з імі канкурыраваць і перамагаць.

— Наконт «тыражнага» пытання... Мяжа 2004 і 2005 гадоў — тыраж «СБ» вырас ледзь не ў два разы. Гэты феномен можна разглядаць як своеасаблівую сенсацыю ў журналістыцы. А як бы вы пракаментавалі сітуацыю — як адміністратар, рэдактар, творчая асоба?

— Мы паставілі задачу змяніць структуру чытацкай аўдыторыі. Таму што «СБ» на працягу 80—90-х гадоў пазіцыянавала сябе як газета для старэйшага пакалення, для пенсіянераў. З улікам гэтага і будавалася рэдакцыйная палітыка. Персанал газеты, у тым ліку журналісты, таксама былі людзі пераважна пажылыя, якім лёгка размаўлялася з равеснікамі. Чытачы біялагічна старэлі, іх усё задавальняла... А што далей? У такім выглядзе ніякай перспектывы, абсалютны тупік. Неабходна было прыцягнуць да газеты новыя, больш маладыя слаі чытачоў. Спатрэбілася ў чымсьці ўзаемавыключальная работа, каб не адвярнуць ад газеты даўніх сяброў і ў той жа час прыцягнуць моладзь. Для гэтага трэба было змяніць структуру журналісцкага корпусу, каб у газету прыйшлі людзі, здольныя разумець сутнасць праблематыкі для маладых чытачоў і мець той жа "тэмбр голасу». Гэтая нялёгкая работа працягвалася не месяц і нават не год. Але, згодна з вынікамі аднаго з апошніх маніторынгаў, сярод нашых чытачоў значна больш высокі працэнт маладых чытачоў, чым сталых.

Што датычыцца нашай тыражнай сітуацыі, пра якую вельмі шмат гавораць: сябры — з радасцю, нядобразычліўцы — з зубоўным скрыгатам... У нас каля 400 тысяч падпісчыкаў: людзі, якія галасуюць сваімі кашалькамі за газету. Напрыклад, у Гомельскай вобласці — прыкладна каля 70 тысяч, падобная сітуацыя і па іншых абласцях. Найменш падпісчыкаў у Мінску, і гэта зразумела: у сталіцы газету звычайна чытаюць раніцай, калі ідуць на працу. Мы ўлічваем усе нюансы, выкарыстоўваем разнастайныя прыёмы падачы інфармацыі, змяненне фармату, графікі, каб газета была зручнай для метро, іншага транспарту, для ранішняга чытання.

У звычайныя дні ў розніцу прадаецца да 12—15 тысяч экзэмпляраў «СБ», у пятніцу — каля 100 тысяч.

Астатняе (каля 70 тысяч) — ведамасная падпіска. Яна ў нас звычайна была каля 30 тысяч. Але потым за справу ўзяліся мясцовыя органы ўлады, якія імкнуцца на ўсе СМІ пашырыць падпіску. Мяркую, справа гэта карысная, дзяржаўная. Таму што газета, сузаснавальнікам якой з'яўляецца Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і якая публікуе найважнейшыя дзяржаўныя дакументы і матэрыялы, з'яўляецца неабходнай і актуальнай для працоўных калектываў. Але, паўтараю, у нашым тыражы гэта толькі 50 тысяч. Калі б іх не было, прынцыпова нічога не змянілася б.

...І ўсё ж гэта служыць пастаяннай нагодай для «шпілек», уколаў, спекуляцый.

— Вы гэта адчуваеце?

— Безумоўна. Хто гэтага не адчувае?.. Напачатку я перажываў, запрашаў розных паважаных апанентаў: калі ласка, прааналізуйце, што такое для вялікай газеты 50 тысяч? Будуць яны ці не — усё роўна; 400 тысяч экзэмпляраў — тыраж для Еўропы грандыёзны, а для краіны ў 10 мільёнаў чалавек... Прычым газета нятанная (на жаль, не ўсе ў нас могуць дазволіць сабе такую раскошу — выпісваць або купляць газету). Мае аргументы на апанентаў не дзейнічаюць: звычайная дробная зайздрасць альбо нежаданне разабрацца ў сітуацыі...

Вядуцца, ведаю, і такія размовы: нібыта «СБ» сядзіць на карку падаткаплацельшчыкаў... Нярэдка чую прэтэнзіі: «Чаму мяне не друкуеце?!» Звычайна адказваю: не друкую вас, сябры, таму што вы дрэнна пішаце. Вось і ўсё, мяне не цікавяць рэгаліі, памкненні, фізічная і палітычная вага. Напішаце добра — адразу апублікуем!

А што датычыцца «на карку падаткаплацельшчыкаў»... Пачаўся жнівень, і за 8 месяцаў 2007 года мы не ўзялі ў казне ніводнай капейкі.

— «Советская Белоруссия» выйшла на самаакупнасць?

— Мы не бяром грошай у дзяржавы. Слова «самаакупнасць» — не эканамічнае. Да нас з бюджэту не паступае ні капейкі.

— Інакш кажучы, рэдакцыя выпускае газету за свой кошт: падпіска, рэклама і...

— ... і розніца.

— І ўсё сыходзіцца, выдатна зводзяцца канцы з канцамі?

— Ды не, зусім не выдатна «ўсё сыходзіцца», бо штомесяц мы выплачваем каля 300 мільёнаў рублёў падаткаў. Давайце падлічым: 300 х 8 = 2400. Два мільярды чатырыста мільёнаў рублёў — прыкладна менавіта на гэту суму папоўніўся бюджэт нашага роднага Савецкага раёна г. Мінска.

— Апошнім часам «СБ» значна змянілася і па падачы інфармацыі, і чыста знешне. Частка нумара друкуецца на глянцавай паперы.

— Толькі для Мінска.

— Магчыма, «СБ» паступова ператворыцца з газеты ў штодзённы часопіс?

— Ды не, навошта?! Глянцавая папера — гэта імкненне разнастаіць дызайн. У Беларусі пакуль што недастатковыя (скажам мякка) паліграфічныя магутнасці. Калі газету з Мінска ў Кобрын вязуць на аўтамабілі, а адтуль падпісчыку ў вёску — яшчэ за 40 км па бездарожжу і, магчыма, разгільдзяйству... Такая газета не можа быць аператыўнай, а значыць, гэта ўжо пародыя на газету. У абласных цэнтрах павінны з'яўляцца друкарні, куды можна было б, выкарыстоўваючы найноўшыя камунікацыі, перадаць газету — у тую ж хвіліну, як яна ў Мінску паступае ў друкарню. Тэрмін дастаўкі да падпісчыка скароціцца на палову сутак.

Давайце адкрыта скажам і пра тое, што вельмі мала краін у Еўропе, дзе можна ўбачыць чорна-белую газету. Гэта дакор... Хоць на гэты конт ёсць розныя думкі.

— У некаторых краінах газеты выходзяць менавіта на «газетнай», а не на белай і не на глянцавай паперы, бо тэкст лягчэй чытаецца, зусім іншая кантрастнасць — адпаведныя даследаванні праводзіліся...

— Ёсць мноства самых розных поглядаў. Але ўсе маркетынгавыя даследаванні сведчаць: людзі аддаюць перавагу каляровым газетам. Сітуацыя, аналагічная кінематаграфічнай. Многія гледачы імкнуцца глядзець каляровае кіно, хоць некаторыя рэжысёры аддаюць перавагу чорна-беламу, бо гэта дае больш сэнсавых, інтанацыйных магчымасцяў...

Так ці інакш, у Беларусі павінны быць сучасныя друкарні.

— Павел Ізотавіч, на сёння вы прадстаўляеце не толькі штодзённую газету, але цэлы холдынг, у складзе якога газеты «Minsk times», «Голас Радзімы», часопіс «Беларусь». А што ў перспектыве? Магчыма — выдавецтва, выдавецкі дом, радыё- або тэлеканал?

— Не. Вельмі не люблю слова «холдынг». Яно скампраментаванае разнастайнымі інтэрпрэтатарамі падобных з'яў. «Холдынг» азначае зусім не збор жабракоў (у нашым выпадку немаёмасных выданняў), якія жывуць на датацыю дзяржавы. (Ну які гэта холдынг?!). Холдынг — сукупнасць вытворчых структур, адны з якіх з'яўляюцца фінансавымі донарамі для іншых. А сядзець на бюджэтнай іголцы...

Было прынята рашэнне, згодна з якім пры рэдакцыі «СБ» выходзяць выданні для замежнага чытача. Але... Часопіс «Беларусь» за мінулы год (з жахам падлічылі!) прынёс страт на 380 млн рублёў, паколькі міністэрствы і ведамствы, здавалася б, зацікаўленыя ў гэтым выданні, з намі проста... забыліся расплаціцца.

Вялікія надзеі мы ўскладалі на гэты часопіс. Пачалі выпускаць яго на англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай, партугальскай, польскай, італьянскай мовах. У сувязі з фінансавымі праблемамі зараз скарацілі мовы да англійскай, французскай, нямецкай. Але іспанскую трэба вяртаць — адкрываецца велізарны накірунак у Лацінскай Амерыцы...

Газета «Minsk times» таксама фінансава стратная. Яна выходзіць на добрай англійскай мове, яе перакладаюць у Вашынгтоне (заключаны адпаведныя дамовы). Газета карыстаецца вялікай цікавасцю на Захадзе, яе чытаюць.

Канцэпцыя створаная у 50-х гадах газеты «Голас Радзімы» ўстарэла. Работа з дыяспарамі была калісьці клопатам і культуралагічных арганізацый, і органаў дзяржбяспекі, разведкі і іншых зацікаўленых ведамстваў. Тады важна было, каб беларуская дыяспара ў розных краінах была ўцягнута ў жыццё БССР... Газета запакоўвалася ў канверт і дасылалася на адрас канкрэтнага чытача. Але часы змяніліся, увогуле гэта вельмі стратная справа... Таму я істотна змяніў канцэпцыю. Зарэгістраваны дыяспары больш чым у 40 краінах свету, гэта ў асноўным нашчадкі беларускіх эмігрантаў, якія не хочуць губляць сувязь з гістарычнай Радзімай. «Голас Радзімы» застаецца газетай, дзе можна атрымаць усю неабходную інфармацыю, але асноўную «дынамічную» частку я перавёў у сетку, у форумы, дзе людзі могуць знаёміцца, абменьвацца вопытам работы сваіх суполак, дыскутаваць... Думаю, гэта правільна. А што да саміх цэнтраў дыяспар — праз Пасольства Беларусі ў Расіі мы кіруем «Голас Радзімы» ў інфармацыйных пакетах разам з іншымі патрэбнымі для падтрымкі дыяспар матэрыяламі.

Найбольш буйная выдавецкая структура, разлічаная на знешнеінфармацыйную дзейнасць, — газета «Саюз», рэдакцыя якой знаходзіцца ў Маскве і ў Мінску. «Российская газета» і «СБ» — «ракетаносьбіты» гэтага выдання. За шэсць гадоў ніводнага зрыву не было, хоць часам складана дабівацца кансенсусу: у расійскай часткі рэдакцыі свае погляды на праблемы Саюзнай дзяржавы, на ролю Беларусі. Яны хацелі б дамінаваць нават у інфармацыйным плане... Нямала сіл і часу ішло на тое, каб праз кампрамісы выходзіць на пазіцыю кансенсусу ў вельмі складаных і далікатных праблемах (такіх, як энергетычны крызіс). Наша агульнае выданне рабіла ўсё, каб «кошка» не пробегла паміж беларускімі і расійскімі чытачамі. Мяркую, гэта адзіны сур'ёзны жыццяздольны, эфектыўны медыйны праект, які дапамагае зближэнню і разуменню паміж чытачамі нашых краін. І не толькі паміж чытачамі.

Галоўны вектар, з якім я звязваю развіццё газеты, — глабальная сетка. Значную частку газеты мы перавялі ў віртуальную прастору. Наш форум саступае на сёння хіба што інфармацыйным агенцтвам... Колькасць карыстальнікаў вельмі высокая, мы сярод лідараў.

— Не выцесніць «віртуальнасць» паперовую газету, не адчуваеце такой небяспекі?

— Не выцесніць! На наш век хопіць. Хоць над гэтым вельмі сур'ёзна думаем... А наконт выдавецкіх дамоў і іншага — кожны павінен займацца сваёй справай.

— Павел Ізотавіч, напрыканцы, калі дазволіце, некалькі асабістых пытанняў... Праходзіла інфармацыя, што вы зусім выпадкова знайшліся са сваім знакамітым траюрадным братам Леанідам Якубовічам, вядучым тэлепраграмы «Поле цудаў». Гэта газетныя «штучкі» альбо... насамрэч праўда?

— Праўда. Нашы бацькі — стрыечныя браты, якіх развёў лёс. Мой бацька застаўся ў Магілёве, а брат паехаў у Маскву. Наша радство аднавіў Леанід Аркадзьевіч. Мне вельмі хацелася пазнаёміцца, але ж ён ужо быў зоркай «усесавецкай» вядомасці — не хацелася быць, як у Чэхава, тоўстым і тонкім. Сустрэліся ўпершыню ў Мінску пасля канцэрта. Гэта была вельмі цікавая хвалюючая сцэна, ён пачаў клікаць розных знакамітасцяў: «Гэта мой брат!..»

— Вы вельмі падобныя чыста знешне...

— Мы пасябравалі. Мяне радуе, што ён не тыповы маскоўскі тэлевізіёншчык, не нахабны, у яго добрая душа... Папулярнасць яго неверагодная, але пры гэтым ён застаецца душэўным, мілым, дасціпным, стомленым і добрым чалавекам.

— Хадзілі чуткі, што нібыта вы збіраеце старыя прыёмнікі...

— І гэта праўда. У дзяцінстве мне вельмі хацелася мець радыёприёмнік. Але бацькі былі бедныя, такую раскошу дазволіць не маглі... Раптам мне, даросламу ўжо чалавеку, здалося, што можна ажыццявіць сваю дзіцячую мару. І стаў збіраць прыёмнікі — яны нагадвалі мне пра дзяцінства. Дый кожны апарат нясе адбітак эпохі: савецкія, нямецкія, амерыканскія, англійскія, французскія...

— У вас вялікая калекцыя?

— Сабраў усе прыёмнікі, якія выпускаліся з другой паловы 1930-х гадоў і да таго часу, калі яны саступілі месца маленькім транзістарам... Іх у мяне шмат, няма куды ставіць. Па дачы з цяжкасцю рукаюся, яны выцясняюць мяне з жылля...

— Колькі слоў пра вашу сям'ю. Цікава, жонка мае адносіны да журналістыкі?

— Не. Зараз яна хатняя гаспадыня. Па прафесіі — гід-перакладчык (французская мова), працавала ў «Інтурысце». Сын — студэнт БДУ.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Шчыра віншуем усіх супрацоўнікаў і чытачоў «Советской Белоруссии» з юбілеем!

Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 63 (7393) | ЧАЦВЕР, 9 ЛІПЕНЯ | 1942 г.

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

НАША СЛАЎНАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ВЯДЗЕ ГЕРАІЧНАЕ ЗМАГАННЕ З ГІТЛЕРАЎСКІМІ ПОЛЧЫШЧАМІ НА ФРОНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ, ЗНІШЧАЕ РЭЗЕРВЫ І ТЭХНІКУ ВАРАГА.

ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ БЕЛАРУСІ! МАЦНЕЙ ГРАМІЦЕ АКУПАНТАЎ У ТЫЛУ, НЕ ШКАДУЙЦЕ ПАТРОНАЎ СУПРОЦЬ ПРЫГНЯТАЛЬНІКАЎ НАШАЙ РАДЗІМЫ!

ВОРАГ БУДЗЕ РАЗГРОМЛЕНЫ

Вераломна, па-разбойніцку напаўшы на нашу радзіму ў чэрвені мінулага года, гітлераўцы выхваляліся, што за шаўтары-два месяцы яны «пакончаць» з Чырвонай Арміяй, разгромяць Савецкі Саюз. Прайшоў год вайны. Нямецка-фашысцкія войскі не толькі не перамаглі, але наблізіліся да свайго поўнага краху. Чырвоная Армія не толькі не знішчана, але ўмацавалася.

Гітлераўская армія за год вайны страціла забітымі, параненымі і палоннымі каля 10 мільёнаў чалавек, у тым ліку не менш трох з палавінай мільёнаў забітымі. Цяпер нямецкая армія зусім не тая, што год таму назад. У ходзе вайны яна аслабла, перабіты адборныя фашысцкія дывізіі. Сілы ворага і яго рэзервы на сыходзе. Чырвоная Армія развеяла хлусню аб «непераможнасці» нямецка-фашысцкіх войск.

Цяпер нямецка-фашысцкае камандаванне ўжо не можа праздрамаць наступальныя аперацыі на ўсяму фронту. Немцы могуць стварыць перавагу ў сіле толькі на адным ці двух участках фронту, ды і то за кошт аслаблення сваіх войск на іншых участках.

Чырвоная Армія знішчыла больш 250 танкаў і звыш 15.000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Толькі за 25 дзён немцы страцілі пад Севастопалем да 150 тысяч салдат і афіцэраў, з іх не менш 60 тысяч забітымі, больш 250 танкаў, да 250 гармат, больш 200 самалётаў.

Нядарма гаворыць наша беларускія калгаснікі: «Гітлер хваліцца, а фрыцы валяцца».

А Гітлер сапраўды хваліцца. Гэты абармот і забойца хлусіць, выдумляе, утойвае свае велізарныя страты, расіпсвае свае «поспехі» ў дзесяткі раз больш, чым яны ёсць у сапраўднасці. Ён хоча падняць упаўшы дух сваёй арміі.

Гітлер спяшаецца атрымаць хоць-бы некаторыя часовыя поспехі. Ён спяшаецца, бо сам разумее, што яго чакае немінучая пагібель. Ён хоча адтэрмінаваць дзень справядлівай грознай расплаты за ўсе злачынствы свавольнікаў-ваўкоў зграі. Гітлер ведае, што Совецкі Саюз, Англія і ліпеня на Курскім напрамку Чырвоная Армія знішчыла

На фронтах Айчыннай вайны

ЗНІШЧАНА 1.700 ГІТЛЕРАЎЦАЎ

На адным з участкаў заходняй Варонежа наша танкавая часць стрымліве націск буйных сіл праціўніка. У выніку бою на працягу дня знішчана 700 гітлераўцаў, 14 нямецкіх танкаў, 6 супрацьтанкавых гармат, 7 аўтамашын і 2 мінамётных батарэі.

На другім участку нашы артылерысты і пехацінцы на працягу двух дзён адстойвалі насялёны пункт ад пераважаючых сіл праціўніка. На подступах да вёскі гітлераўцы страцілі толькі забітымі звыш 1.000 салдат і афіцэраў.

ПАДБІТА 80 ТАНКАЎ

У раёне горада Стары Оскол ідуць напружаныя баі з пяхотай і танкавымі войскамі праціўніка.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ. Байцы ідуць у атаку.

ГЕРОІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

СЕРЖАНТ СЦЯПАН ПАТОРЫН

Лейтэнанта пахавалі на тым-жа хутары, дзе разгралася бітва. Сержант Паторын узяў на ўспамін хустачку свайго лейтэнанта, якая ляжала ў левай кішэні гімнасцёркі. І цяпер, зірнуўшы на хустачку лейтэнанта, Сцяпан Паторын, нібы на экране, бачыць яго родны чалавек, адкуль страляў сяржант. У совецкага воіна на сыходзе былі патроны, але ў яго было шэсць гранат, была воля да барацьбы і вялікая нянавісць да чужынцаў.

Сяржант выскачыў з хаты і кінуў адну за другой

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося 7 дзён

Як да першай настаўніцы

Уладзімір Гілеп, старшыня Беларускага фонду культуры:

Са «Звяздой» звязана амаль усё маё свядомае жыццё. Я ўдзячны газеце за тое, што маю магчымасць чытаць яе штодзень. Яна стала, вобразна кажучы, маёй першай і адзінай «настаўніцай» беларускай мовы, калі я ў юнацтве быў пазбаўлены ўмоў вывучаць у школе родную мову, бо пэўны перыяд жыў па-за межамі Беларусі. Дзякуючы газеце я ў тыя гады авалодаў мовай, зацікавіўся культурай, традыцыямі і спадчынай Радзімы.

З таго часу «Звязда» заўсёды побач са мной. А я, між іншым, маладзейшы за яе толькі на 20 гадоў. Так што гісторыя вашага выдання, яго асноўныя вехі станаўлення і асабліва развіцця ў пасляваенны час мне добра вядомыя. І мушу адзначыць, гэта дастойны шлях. Ва ўсе часы «Звязда» вылучалася сур'ёзным і ўзважаным падыходам да асвятлення падзей і праблем жыцця рэспублікі. За гэта яе паважаюць і цэняць дзесяткі тысяч чытачоў.

Напярэдадні юбілею зычу вашаму таленавітаму рэдакцыйнаму калектыву новых поспехаў і здабыткаў на інфармацыйным полі, дзе сёння ўсталявалася даволі жорсткая канкурэнцыя. Але ў «Звязды» ёсць бясспрэчныя перавагі: беларуская мова, шматгадовыя традыцыі, вопыт многіх пакаленняў звяздоўцаў, якія заўсёды былі лепшымі сярод журналістаў Беларусі, зразумелая пазіцыя выдання па многіх спрэчных пытаннях і ўвага да меркаванняў чытача.

У МАГІЛЁВЕ АДРОДЗЯЦЬ РАТУШУ

Будаўніцтва магілёўскай ратушы пачалося і будзе завершана ў наступным годзе да свята горада, якое традыцыйна адзначаецца напрыканцы чэрвеня. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» заявіў старшыня Магілёўскага гарвыканкама Віктар Шорыкаў.

Каменная гарадская Ратуша лічылася адным з лепшых помнікаў градмадзінскай архітэктуры Магілёва і Беларусі. Яна была пабудаваная ў другой палове XVII стагоддзя. Ратуша з высокай вежай (каля 40 метраў) радавала вока пры пад'ездзе да Магілёва з боку Дняпра. У 1780 годзе з вежы аглядалі Магілёў руская імператрыца Кацярына II і аўстрыйскі імператар Іосіф II. Ратуша была пабудаваная трывала — яна прастаяла амаль тры стагоддзі.

Пасля вызвалення Магілёва ў 1944 годзе спецыяльная камісія, якая выяўляла ўрон, учынены фашыстамі, адзначыла, што ратуша пашкоджана, але можа быць адноўлена. У 1953 годзе старажытны будынак быў аб'яўлены помнікам архітэктуры, і нават пачалася яе рэстаўрацыя. Аднак потым, відаць, савецкія ўлады ўсё ж вырашылі не выдаткоўваць вялікія сродкі на аднаўленне будынка, і на золку ў ліпені 1957 года Ратушу ўзарвалі, а вежу павалілі з дапамогай тросаў і трактароў.

Цяпер, роўна праз паўстагоддзе пасля таго разбурэння, у Магілёве на валу каля Дняпра нарэшце распачалася пабудова новай ратушы — знакавага для горада будынка.

8 жніўня тэрмінова збяруцца на сесію дэпутаты Магілёўскага гарадскога Савета, каб прыняць рашэнне аб аднаўленні ратушы.

— Мы сёлета не планавалі пачынаць работы на Ратушы, таму што значныя сродкі з бюджэту былі накіраваныя ў пабудову маставога пераходу ў цэнтры горада, — тлумачыць кіраўнік выканаўчай улады Магілёва Віктар Шорыкаў. — Аднак цяпер мы ўбачылі, што гарадскі бюджэт нядрэнна выконваецца...

Гарадская ўлада таксама абапіраецца на матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць», прысвечанай 740-годдзю Магілёва, якая адбылася нядаўна, і якая ўхваліла ініцыятыву гарвыканкама па адбудове ратушы. Гісторыкі прапанавалі арганізаваць агульнагарадскі суботнік і адкрыць спецыяльны разліковы рахунак па зборы сродкаў на пабудову ратушы.

Як паведаміў Віктар Шорыкаў, тэндар на будаўніцтва ратушы выйграла магілёўская арганізацыя «Прамжылбуд». І на месцы будаўніцтва ўжо з'явілася агароджа і пачаліся земляныя работы. Старшыня гарвыканкама плануе, што будынак будзе стаяць ужо сёлета, а яго аздабленне зробяць у наступным годзе. Паводле папярэдніх падлікаў, на будаўніцтва Ратушы будзе выдаткавана прыкладна 5 мільярдаў рублёў. На першым паверсе, паводле планаў мэрыі, размесцяцца экспазіцыі Музея гісторыі Магілёва. — Таксама ў ратушы будуць праводзіцца ўсе ўрачыстыя цырымоніі, святкаванні памятных дат і ўшанаванні, — расказаў Віктар Шорыкаў. — Таму там будзе зроблена прыгожая цырыманіяльная зала.

Ёсць таксама планы зрабіць на вежы гадзіннік і ўверсе — невялікую агледную пляцоўку. Многія магіляўчане мяркуюць, што ратуша была і застанецца сапраўдным сімвалам іх горада.

Ілона ІВАНОВА.

САМЫ КАРЫСНЫ МЁД — З РАЗНАТРАЎЯ

Такую думку выказаў старшыня праўлення Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускія пчаляры» Міхаіл Халадзінскі на прэс-канферэнцыі ў Мінгарвыканкаме. «Мёд неабходна ўжываць не толькі ў час хваробы ў якасці лякарства. Гэты лекавы прадукт павінен быць пастаянна на стале беларусаў».

СЛУП «ЗАТРЫМАЎ» П'ЯНАГА

Вадзіцель, які ля свайго дома пашкодзіў слуп электраперадачы, уцёк з месца здарэння. Гэта не дапамагло яму пазбегнуць адказнасці.

На лініі электраперадач у вёсцы Віктасіна электрыкі заўважылі збоі. Калі яны прыехалі выправіць непаладкі, то ўбачылі, што слуп электраперадач пашкоджаны ў выніку ўдару аўтамабіля. Супрацоўнікі ДАІ ўстанавілі, што віноўнік аварыі, мясцовы жыхар, вадзіцель СВК «Гервяты», не справіўшыся з кіраваннем, урэзаўся ў слуп. Прычынай стала кіраванне транспартам у нецвярозым стане. Пасля здарэння ён схаваў ЗІЛ за хату. Гэта не перашкодзіла міліцыянерам знайсці гаспадара машыны.

Вадзіцель заплаціць штраф у памеры 200 тысяч беларускіх рублёў і будзе на год пазбаўлены правоў.

Аляксандр СЯНЮЦЬ, *Астравецкі раён.*

Аляксандр КОСІНЕЦ:

«ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ АЛІМПІЙСКІХ НАДЗЕЙ СТВОРАНЫ ЎСЕ ЎМОВЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ГУЛЬНЯЎ-2008»

За 373 дні да пачатку XXIX летніх Алімпійскіх гульняў у Мінску адбылося пасяджэнне аргкамітэта «Пекін-2008». Абмяркоўваліся пытанні аб кандыдатах і трэнерскім складзе для ўдзелу ў будучай Алімпіядзе, работы абласных выканаўчых камітэтаў па забеспячэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы, аб медыка-біялагічным суправаджэнні, уключаючы антыдопінгавую кампанію.

Больш увагі маладым і перспектыўным

Падрыхтоўка да Алімпіяды ў Пекіне вядзецца ў адпаведнасці з праграмай калегіі Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальнага алімпійскага камітэта. У снежні мінулага года быў разгледжаны ход падрыхтоўкі да Гульняў-2008, скарэктаваны спіс спартсменаў. У групу «А» трапілі 168 атлетаў з 23 відаў спорту, якія рэальна могуць прэтэндаваць на прызавыя месцы ці месцы ў першай васьмёрцы.

— Наша дзяржава ўдзяляе самую пільную ўвагу падрыхтоўцы беларускіх спартсменаў да Алімпіяды ў Пекіне, — заявіў Аляксандр Косінец, намеснік прэм'ер-міністра і кіраўнік аргкамітэта «Пекін-2008». — Яна кантралюецца кожны месяц, кожны дзень. Робіцца ўсё, каб умовы для падрыхтоўкі былі аптымальнымі. Я папрасіў бы больш увагі ўдзяліць нашым маладым, перспектыўным спартсменам, у тым ліку з рэгіёнаў...

Прайшло толькі 7 чэмпіянатаў свету і 17 чэмпіянатаў Еўропы, наперадзе яшчэ 12 першынстваў, але нашы спартсмены ўжо выканалі 73 нарматывы ў шасці відах спорту. Больш за ўсё пуцёвак в Пекин на рахунку лёгкаатлетаў.

Калі б Алімпіяда была сёння?

Сёлета беларусы заваявалі 35 медалёў у алімпійскіх дысцыплінах (16 з іх — залатыя). Паводле слоў міністра спорту і турызму Аляксандра Грыгарава, ужо зараз можна сказаць, якія краіны складуць першы дзесятак у камандным заліку і заваююць найбольшую колькасць медалёў:

— Канешне, некаторыя людзі жартуюць, што гаспадары Алімпіяды возьмуць максімум медалёў, а астатнія паміж сабой разыграюць госці. Сэнс у гэтым ёсць, калі ўзгадаць, наколькі развіта ў Кітаі навуковае забеспячэнне каманд, наколькі актыўна там праводзіцца даследчая праца: на аднаўленне толькі антыдопінгавай лабараторыі ў Пекіне траціцца 12—16 мільёнаў долараў у год. І ўсё ж я перакананы, што 50 працэнтаў узнагарод падзеляць паміж сабой дзесяць краін — Расія, ЗША, Кітай, Англія, Францыя, Германія, Італія, Куба, Японія, Карэя. Беларусь будзе імкнуцца паўтарыць вынік Алімпіяды ў Сіднеі-2000, калі было 17 узнагарод».

Аднак рабіць прагнозы «залатых», «сярэбраных» і «бронзавых» медалёў наўрад ці варта, бо гэта — вялікі псіхалагічны ціск на спартсменаў. Хваляванняў у алімпійцаў і без таго хапае. У прыватнасці, беларусаў правяраюць на допінг часцей, чым шэраг замежных каманд.

На пытанне, ці стане хтосьці з беларусаў у Пекіне аўтарам спартыўнай сенсацыі, як брэсцкая лёгкаатлетка Юлія Несцярэнка ў Афінах, міністр заўважыў, што «ў спорце цуды здараюцца не часта, але будзе прыемна, калі нехта парадуе». Што датычыцца самой Юлі, то Аляксандр Грыгараў паведаміў наступнае: «Спартсменка прайшла курс лячэння ў Інстытуце траўматалогіі (у Юлі былі праблемы са спінай) і зараз аднаўляецца. Мяркую, што ў 2008 годзе Юля будзе ў форме».

Ірына ПРЫМАК.

У ПРЫЁМНУЮ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КАМІСІІ ПА ПРАВАХ ДЗІЦЯЦІ ШТОДЗЁННА ПАСТУПАЕ ДА 100 ЗВАРОТАЎ

Учора тут прымаў наведвальнікаў старшыня камісіі віцэ-прэм'ер Беларусі Аляксандр Косінец. Як ён адзначыў у размове з журналістамі, неабходна не проста выслухаць просьбу, з якой прыйшоў чалавек, а сапраўды аказаць дапамогу, вырашыць праблему. «Часам сустракаюцца вельмі складаныя і заблытаныя сітуацыі, — адзначыў ён. — Грамадзяне прыйшлі на прыём якраз з тымі праблемамі, якія можна вырашыць толькі на дзяржаўным узроўні».

Падводзячы вынікі сваёй работы ў прыёмнай Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, Аляксандр Косінец расказаў карэспандэнту БЕЛТА, што ён разгледзеў 14 зваротаў дзяцей і іх законных прадстаўнікоў. Напрыклад, да віцэ-прэм'ера звярнулася група грамадзян па пытаннях набыцця дарагіх лякарстваў для забеспячэння жыццядзейнасці беларускіх дзяцей з вельмі цяжкімі генетычнымі захворваннямі. Рэспубліканская грамадская прыёмная Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці працуе ў будынку Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі па адрасе: вул. Кірава, 16, каб. № 1, тэл. 227-31-38. У цэнтры вядзецца папярэдні запіс грамадзян на прыём, працуе ў прыёмнай і дзяжурны на выпадак аператыўных пытанняў.

БЕЛАГРАПРАМБАНК І МІНСКІ ТРАНЗІТНЫ БАНК АБ'ЯДНОЎВАЮЦЬ НАМАГАННІ

для папулярызацыі Інтэрнэт-банкінга

ААТ «Белаграпрамбанк» і ЗАТ «Мінскі Транзітны Банк» падпісалі Мемарандум аб намерах па стварэнню аб'яднанай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы па прадуктах катэгорыі «Інтэрнэт-банкінг». Сутнасць пагаднення ў тым, каб аб'яднаць маркетынгавыя намаганні двух банкаў па папулярызацыі сярод жыхароў краіны банкаўскага абслугоўвання праз Інтэрнэт.

Пасля падпісання дакумента, старшыня праўлення ААТ «Белаграпрамбанк» Сяргей Румас заявіў, што крок па аб'яднанню намаганняў двух банкаў, якія аднымі з першых працуюць на рынку Інтэрнэт-банкінга ў рэспубліцы, «будзе сур'ёзным крокам у частцы папулярызацыі гэтай новай, з тым прагрэсіўнай паслугі».

Ён дадаў, што дагэтуль рэкламная кампанія Інтэрнэт-банкінга была арганізавана банкам «не дастаткова эфектыўна, бо вельмі многія людзі не ведаюць, што гэта за паслуга». «І мы вырашылі аб'яднаць намаганні банкаў для таго, каб павысіць дасведчанасць насельніцтва аб гэтай паслузе».

Паводле слоў старшыні праўлення ЗАТ «Мінскі Транзітны Банк» Андрэя Жышкевіча, сёння ў свядомасці кліента

Ідэі і людзі

ЁСЦЬ ТАКАЯ МАРКА — «РАДАМІР»

Сёлета рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству «Гомельскі лікёра-гарэлачны завод» спаўняецца 110 гадоў, і гэты своеасаблівы юбілей, калі яго так можна назваць, калектыў сустракае дастойнымі поспехамі ў працы. Аб гэтым сведчаць многія факты.

Пачнём з таго, што за І паўгоддзе прадпрыемства вырабіла 580 тысяч дэкалітраў гарэлкі і лікёра-гарэлачных вырабаў, што на 24,5 працэнта больш за ўзровень адпаведнага перыяду мінулага года. Аб'ём рэалізацыі ўказанай прадукцыі (а прадаецца яна ў розных рэгіёнах рэспублікі) павялічыўся на 12 працэнтаў.

Вядома, што кожны працоўны калектыў ганарыцца тым, калі яго тавары адпраўляюцца за межы сваёй краіны і адтуль ідуць заяўкі на іх. У гэтым плане неабходна сказаць, што на рынку алкагольнай прадукцыі ідзе жорсткая канкурэнцыя, а на сусветнай арэне выпуску яе дамінуюць такія краіны, як Расія, Германія, Украіна, Францыя, Італія. Спаборнічаць з імі параўнальна невялікай Беларусі, у тым ліку і Гомельскаму ЛГЗ, вельмі і вельмі няпроста. Тым не менш, калектыў, як гаворыцца, знаходзіць сваё «месца пад сонцам», паспяхова канкуруючы з вядомымі фірмамі гэтых краін і пастаўляючы сваю прадукцыю за мяжу.

Так, сёлета працягваўся экспарт алкагольных тавараў у Латвію. За І паўгоддзе туды ўжо адгружана 5 тысяч дэкалітраў алкагольнай прадукцыі. Сувязі з гэтай краінай у гамяльчан даўнія і трывалыя.

На маё пытанне аб тым, а ці можна тое ж самае сказаць у адносінах да Расіі, бо, як вядома, гэты рэгіён вельмі абаронены ў сэнсе паставак алкагольнай прадукцыі (руская гарэлка карыстаецца попытам ва ўсім свеце), спецыялісты прадпрыемства адказалі наступнае. Летась у лістападзе ў Маскве з удзелам Гомельскага лікёра-гарэлачнага завода было заснавана таварыства з абмежаванай адказнасцю «БеларусьАлка» з мэтай пашырэння паставак беларускай алкагольнай прадукцыі на расійскі рынак, і гэта адкрыла новыя магчымасці і для гамяльчан. Дастаткова сказаць, што ў другой палове чэрвеня яны экспартавалі туды першую партыю гарэлкі «Палессе Прэміум», «Хмяльная чарка», «Залатая Рысь» і гарэлкі асобай «Мядовая з перцам» аб'ёмам 1000 дэкалітраў. Не за гарамі і адпраўка туды чарговай партыі алкагольнай прадукцыі, у тым ліку і спецыяльна распрацаваных па іх заказу лікёраў шасці найменняў серыі «Какаду». Гэта будзе зроблена ўжо ў жніўні.

Экспартныя пастаўкі Гомельскага завода за І паўгоддзе гарэлкі і лікёра-гарэлачных вырабаў склалі 5,91 тысячы дэкалітраў, што на 21,3 працэнта больш за адпаведны мінулагодні паказчык. За межы нашай краіны пастаўлялася таксама галаўная фракцыя этылавага спірту і канцэнтрат кваснага сусла. У І паўгоддзі экспарт гэтых прадуктаў склаў адпаведна 6,9 і 4 тысячы дэкалітраў. Добры паказчык, і на ім прадпрыемства не мае намеру спыняцца. Яго кіраўнікі клапоцяцца аб наладжванні сувязяў з іншымі замежнымі партнёрамі, гатовымі стаць рэалізатарамі прадукцыі завода. Бо яна, гэта прадукцыя, ужо неаднаразова ярка пацвярджала сваю высокую якасць на міжнародным узроўні і перавагі перад канкурэнтамі, калі прадпрыемства ўдзельнічала ў самых прэстыжных конкурсах, дэгустацыях і выставах.

Адна з апошніх, якая называецца «DRINEXPO-2007»: міжнародны форум напояў», праходзіла з 18 па 20 чэрвеня ў Санкт-Пецярбургу пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі і камітэта эканамічнага развіцця, прамысловай палітыкі і гандлю ўрада гэтага горада. Тут гамяльчане атрымалі цэлы россып узнагарод. У рамках выставы праходзіў міжнародны дэгустацыйны конкурс алкагольных напояў, і прафесіяналы аддалі належнае прадукцыі гамяльчан. А менавіта: у сваіх намінацыях бальзам «Палессе» ўдастоены галоўнага прыза — гран-пры, а бальзам «Садко» і гарэлкі «Палессе Прэміум» і «Радзімічы» — залатых медалёў. Прадпрыемства атрымала яшчэ адзін залаты медаль — за ўдзел у названай выставе, што сведчыць аб яго высокім міжнародным аўтарытэце сярод вытворцаў алкагольнай прадукцыі.

І наогул, дзе б ні праходзілі падобныя міжнародныя выставы — у Маскве, горадзе на Няве, Мінску, Сочы, Рызе, Вільнюсе, Бруселі — вырабы гамяльчан вызначаюцца выдатнымі смакавымі якасцямі і высокім узроўнем іх мастацкага афармлення.

Далёка не кожнае прамысловае прадпрыемства рэспублікі можа пахваліцца такімі дасягненнямі, якія маюць Гомельскі лікёра-гарэлачны завод. Напрыклад, за дзесяць апошніх гадоў яго калектыву ўручана звыш ста ўзнагарод рознай вартасці. Сярод іх: тры — гран-пры, больш за сорак — залатыя, звыш трыццаці — сярэбраныя, больш за дзесяць — бронзавыя медалі. А ёсць жа яшчэ медалі і за дызайн і за выдатную якасць прадукцыі.

Вось славуты бальзам «Чорная каралева». Толькі на працягу 2006—2007 гадоў ён адзначаны Знакам якасці Расійскай Федэрацыі і тройчы ўдастоены золата — на Міжнародным конкурсе «United vodka-2006» у Бельгіі, XIII Міжнароднай выставе-кірмашы «Віно—Гарэлка—Тытунь» у Сочы і XIII Міжнароднай спецыялізаванай выставе «Пецярбургскі кірмаш вінаў і гарэлкі-2006». А чым не высокая марка ў бальзама «Садко». Ён двойчы ўзнагароджаны залатымі медалямі на VIII Дэгустацыйным конкурсе «Прадэкспа-2006» у Маскве і на Міжнародным дэгустацыйным конкурсе алкагольных напояў «DRINEXPO-2007» у Санкт-Пецярбургу і з'яўляецца пераможцам рэспубліканскага конкурсу прадуктаў харчавання «Прадукт года-2006». Акрамя гран-пры, вышэйпамянёны бальзам «Палессе» мае два залатыя медалі на дэгустацыйных конкурсах у Маскве і Мінску і сярэбраны — у Бруселі. Такія найменні гомельскіх вытворцаў, як гарэлка «Сярэбраны век», «Сотка», «Хмяльная чарка», «Палессе Прэміум», «Элітная супер», «Крыштальная», настойка салодкая «Журавінка на каньяку» ў 2006—2007 гадах папоўнілі скарбонку прадпрыемства чатырма залатымі, васьмю сярэбранымі і трыма бронзавымі ўзнагародамі. І гэта — лепшае пацвярджэнне самай высокай якасці прадукцыі гомельскага прадпрыемства, прызнання прафесіяналізму яго калектыву, які ўзначальвае вось ужо чатыры гады генеральны дырэктар Галіна Віларэсаўна Кардасёва, якая прайшла на заводзе працоўны шлях ад майстра да самай галоўнай пасады.

Тут ужо больш за шэсць гадоў дзейнічаюць міжнародныя сістэмы якасці: ISO 9000/2001, HAACP, эканамічнага кантролю ISO-1400, якія ахопліваюць увесь тэхналагічны цыкл і гарантуюць бяспеку алкагольнага прадукту, да ўжывання якога, вядома ж, трэба ставіцца з розумам.

Зараз на прадпрыемстве пачынае свой ход гандлёвая марка «Радамір». У аснову яе назвы, як патлумачылі спецыялісты, пакладзены такі гістарычны факт: на тэрыторыі Гомельшчыны ўздоўж берагоў Сожа і іншых рэк у глыбокай старажытнасці жыло племя радзімічаў, а заснавальнікам яго быў легендарны воін Радзім, або Радамір, абаронца племені. Вось імя гэтага славутага чалавека і вырашылі (як бы гэта лепш мовіць) і адначаць на заводзе.

Пры распрацоўцы этыкетак маркі (а яны выраблены ў адзіным стылі) за аснову браўся меч. На яго рукаятцы нанесены арнамент, які выкарыстоўваўся на ўпрыгажэнні жанчын племені, а ў саму рукаятку як бы ўстаўлены гандлёвы знак воін-вершнік. Вось такая паралель з гісторыяй.

Пад гандлёвай маркай «Радамір» сёння ўжо выпускаецца шэсць відаў прэйскурантнай гарэлкі — «Аква-Плюс», «Цар пушчы», «Сорак кропель», «Сотка», «Хмяльная чарка» і «Салют Перамогі». Прымаюцца ўжо адпаведныя меры пад гэтай жа назвай «Радамір» у новым стылі выпускаць і бальзамы, іншую гарэлку ў сувенірным выкананні і ў адзіным афармленні. Дарэчы, прадпрыемства ўжо наладзіла выраб сувенірнай прадукцыі маркі «Радамір» у скураным афармленні бутэлькі пад яе.

Роўна год таму наша газета прысвяціла дзейнасці калектыву завода цэлую старонку, і я пацікавіўся ў яго спецыялістаў, якія змены адбыліся тут за гэты час. Акрамя названых вышэй, як паведаміла нам у прыватнасці начальнік вытворча-тэхналагічнай лабараторыі Тамара Шупаева, многае зроблена па мадэрнізацыі абсталявання, удасканальвання вытворчасці і г.д. Сярод асноўных арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў і такое, як устаноўка набытай у Італіі новай аўтаматычнай лініі па разліву гарэлкі і лікёра-гарэлачных вырабаў у тару ёмістасцю ад 0,2 да аднаго літра з закаркоўваннем яе як каўпачком вінтавым, так і пластмасавым дазатарам. Пачала дзейнічаць і ўстаноўка так званага зваротнага осмасу, якая паляпшае якасць вады як аднаго з галоўных кампанентаў прыгатавання і выпуску лікёра-гарэлачных вырабаў і гарэлкі.

Атрыманы спірт «Палессе» больш высокай ступені ачысткі, і на ім распрацаваны два віды гарэлкі — «Хмяльная чарка» і «Палессе Прэміум». Памянёны вышэй бальзам «Палессе» — таксама навінка. Ён у адрозненне ад бальзамаў «Садко» і «Чорнай каралевы» больш экстракцыйны. Асвоены выпуск новай групы настоек салодкіх на каньяку і лікёраў на ім.

Адным з асноўных напрамкаў зараз на прадпрыемстве з'яўляецца каньячная вытворчасць. Гэта азначае, што тут наладжаны выпуск каньяку грузінскага пяць зорачак. Вядуцца пэўныя захады на пастаўку на завод каньякоў французскіх з мэтай асваення іх вырабу (хоць гэта і дарагая справа), а таксама каньякоў Малдовы, Расіі і Украіны. З указанай мэтай плануецца таксама паездка спецыялістаў у Арменію.

Адным словам, на прадпрыемстве многае робіцца і многае задумана, каб умацаваць свае пазіцыі на ўнутраным і знешнім рынках.

Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

РУП «ГОМЕЛЬСКІ ЛІКЁРА-ГАРЭЛАЧНЫ ЗАВОД»
246042, г. Гомель, вул. Севастопальская, 106.
Тэл. +375 232 36-12-91
Тэл./факс +375 232 36-36-32, 36-36-18.
E-mail: info@glvz.com.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.24	21.07	15.43
Віцебск —	5.08	21.02	15.54
Магілёў —	5.11	21.00	15.49
Гомель —	5.14	20.57	15.43
Гродна —	5.40	21.21	15.41
Брэст —	5.47	21.15	15.28

Месяц

Поўня 30 ліпеня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Прарока Ілы, Абрама, Аляксандра, Апанаса, Георгія:*
К. *Карыны, Марыі, Густава, Сцяпана.*

Надвор'е на заўтра



Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

...у суседзяў

ВАРШАВА	+20 — +22 °C	Без ападкаў	
МАСКВА	+20 — +22 °C		
ВІЛЬНЮС	+23 — +25 °C	Без ападкаў	
РЫГА	+23 — +25 °C	Без ападкаў	
КІЕЎ	+22 — +24 °C	Без ападкаў	
С-ПЕЦЯРБУРГ	+23 — +25 °C	Без ападкаў	

2 жніўня

Дзве даты

1802 год — у Гродне заснаваны першы гарадскі тэатр. Да 1809 года яго ўзначальвала Саламея Дэшнер.

1932 год — прынята пастанова Савета Народных Камісараў БССР аб увядзенні ў рэспубліцы ўсеагульнай 7-гадовай адукацыі.

Цытата дня:

«Невялікая справа прадказваць будучае — вы лепш паспрабуйце разгадаць сённяшняе».

Хуга Штэйнхаўс.

Простыя рэчы

БУТЭРБРОД ЛУСТА

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У СЯМІДЗЕСЯТЫХ ГАДАХ мінулага ўжо стагоддзя для простага савецкага чалавека стала магчымым выехаць за мяжу, прыкладам у Польшчу. І тут выявілася, што ў суседняй краіне жыве вельмі шмат блізкіх, сваякоў нашых заходнебеларусаў, «заходнікаў», як самі мы сябе называлі. І людзі аднаўлялі гэтыя сваяцтвы, імкнуліся наведаць сясцёр ды братоў, цётак ды дзядзькоў. Сам не ездзіў, хоць нейкая радня і знаходзілася, а вось знаёмыя, сябры ездзілі досыць часта, бо было гэта выгадна і ў плане фінансавым. Нешта везлі туды на продаж, нешта прывозілі адтуль таксама на продаж. Зразумела, цікавіліся: як там жывуць, як прымаюць. Жылі тады ў Польшчы нядрэнна. Але на што скардзіліся мае шматлікія суразмоўцы, дык гэта на небагаты адносна нашаму гасцінны стол. «Паставяць талерку з канапкамі, ды кава і кава, і кава...»

Канапка — слова тады нязвычнае. Думалася, што гэта невялікая канапа, тое, на чым можна прысесці, а то і прылегчы. Але не — гэта бутэрброд па-польску. Дарэчы, і бутэрброд — слова, якое прыйшло да нас з нямецкай мовы, там у іх «Butterbrot». Скібка хлеба, намазаная маслам. Можна дадаць і сыр, і каўбасу, і рыбу і гэтак далей. Але першаснае — хлеб з маслам. Дарэчы, у беларускай мове ёсць свае адпаведнікі гэтага слова. Напрыклад, Вацлаў Ластоўскі перакладае яго як «лусьцік», «лусцень». Ды і мы ў дзяцінстве гаварылі пра лусту хлеба. А што на той лусце — гэта ад заможнасці залежыць.

Дзяцінства. Шасцідзесятыя гады нельга назваць галоднымі. Хапала і бульбы, і скваркі, пастаянна была гародніна і садавіна. Але верхам малечага задавальнення было адрэзаць лусту белага хлеба, макануць яго ў ваду і зверху шчодра пасыпаць цукрам. З такім наедкам выходзілі на вуліцу, каб паказацца перад сябрукамі.

Увогуле ж наша местачковае юнацтва і нават больш сталая пара абыходзіліся без бутэрбродаў. Неяк не прынята было. Шматлюдныя тады застоллі надараліся часта — то ў армію дзецюка выпраўліць, то з арміі прыняць. То вяселлі. Збіраліся застоллямі чалавек пад сто: сваякі, суседзі. А вось бутэрбродаў на стол не ставілі, абыходзіліся іншымі стравамі. Уваходзілі тады ў моду вінегрэты, мясныя салаты, але найперш — проста мяса ці рыба. Смажанае, вараное. Неяк тады і напісалася:

Найчасцей,
як родны мой народ,
Як дастойны
прадстаўнік ягоны —
Аддаю даніну самагону
І з грады зрываю бутэрброд.

Што было — тое было. Абыходзіліся найчасцей самагонкай. А вось на чорным хлебе крыху гарчыцы, а на яе тонкая лустачка сала, а зверху яшчэ гурочак крыху-крыху прасолены... Чаму б і не.

Часам чытачы «Звязды» ў сваіх допісах да мяне нагадваюць: а вось гэтага вы і не прыпомнілі. Так, памяць чалавечая пераборлівая. Ну, пра тое, што бутэрброд заўсёды падае маслам на падлогу, помню. Але помню, магчыма, больш цікавае. З расказаў былога майго старэйшага сябра і вельмі харошага чалавека дзядзькі Пётры. Няма ўжо яго на свеце, але цікавыя яго размовы, усмешкі засталіся. Дык вось, адна з іх і пра бутэрброд.

Ды няхай Пётра раскажа сам.

«Дачнікі аблюбавалі нашу вёску. Возера ж вялікае, чыстае. Вось і будуюцца тут. Зямлю не абрабляюць, а адпачываць летам прыязджаюць. Каля мяне — Мікітавіч. Харошы чалавек, дапамагаю яму часам сеткі кінуць, рыбы налавіць. Вось і ў той раз выбралі мы сеткі. Рыба так сабе, але ён задаволены: вечарам на юшку хопіць. Запрасіў і мяне, каб падышоў на бераг. Упарадкаваў я карову, каня, як стала цёмна, паціху ад жонкі сышоў з хаты, накіраваўся да вогнішча, што свяцілася на беразе. Збіты стол, лаўкі, сядзяць кабеты, мужчыны ля вогнішча юшкай займаюцца. Адразу мне чарку. І адна з кабет падае хлеб з нечым. «Во, дзед, пакаштуй бутэрброд з замежнай прыправай.» Выпіў, а пачуў есці — слізкае, прэснае, ну як той слімак. Перасела ў горле. Але ж мусіў выцерпець, праглынуў.

— Ну, ці з'еў?

— Смаку вялікага няма.

— А чуў што калі пра мідыі, вунь у возеры ракавінкі падобныя, а ўнутры гэта самае.

— Гэтае паскудства, — мяне аж тарганула, — не елі нават пасля вайны, калі падлеткамі шмат чаго елі.

А яны смяюцца. Не пайшла мне і другая чарка. Юшка тая. Старога чалавека слімаком нейкім накармілі. Пайшоў дадому.

А раніцою неяк сама сабою прыйшла думка аддзячыць не столькі мужыкам, колькі гэтым кабетам. Зайшоў да суседа, у таго сябар ветурачом працуе. Але выпівоха, за любую справу бярэцца, абы чарка. Кажу яму: «Ці лягчыць Віктаравіч, цяпер?» «Напэўна, лягчыць, куды яму дзецца. Ды і пара такая».

Угаварыў я суседа, прынёс яму запаветную бутэлечку. І адправіўся той на ровары на пошукі ветурача.

Знайшоў. Недзе па абедзе прывёз мне мяшэчак з гэтым самым. Не разумееш з чым? Ну, вось бычок ці парсюк уваходзіць у сваю сілу. Яму вагу трэба нарошчваць, а ён выбрыквае. Дык яго і лягчаць, выразаюць гэтыя самыя. Дарэчы, калі прыгатаваць як след — страва выдатная. Вось і ўзяўся я за справу, там трэба вылушчыць, добра прамыць, потым выварыць, а потым ужо са спецыямі і засмажыць. Нарабіў я такой смакаты. Нарэзаў батон і намазаў на яго свайго рэчыва. Падноса ў хаце не знайшлося, дык я выклаў свае бутэрброды на вялікае драўлянае дэнка. І як касцёр на беразе запалаў — панёс яго дачнікам. Прынёс, паставіў на стол, кажу: «Во закусь дык закусь. Гэта вам не шашлык, у зубах не завязне».

Мікітавіч глянуў на мяне неяк недаверліва:

— Што гэта, дзядзька Пётра?

— Ды, — кажу, — паштэт такі. Тут і пячонка, і сала, і яйкі. Жонка мая ўмее гатаваць, суседкі рэцэпт бяруць.

Пакаштавалі, а потым пасля чаркі як накінуліся. Не стала майго прысмаку. Але Мікітавіч адвёў мяне ўбок.

— Скажы, чым ты вырашыў нам адпомсціць.

Я і расказаў пра бычка ды парсюка. Ён аж на траву прысеў. Папрасіў толькі, каб жанчынам ні слова не гаварыў».

А, дарэчы, такі бутэрброд і я каштаваў. Неблагая страва. Праўда, спецыфічная.

Сазнаюся. Пісаў гэты артыкул — і перапыніўся. На матчынай кухні адрэзаў скібу хлеба, знайшоў у халадзільніку старога, але няёлкага, мяккага сала, а наверх агурочак, які сарваў з грады... Смачна есці.

Алесь КАСЦЕНЬ.

Віцебская вобласць.

Інфарм-укол

ПІВА І ВІНО САДЗЕЙНІЧАЮЦЬ РАКУ КІШЭЧНІКА

Паўлітровы кубак піва або невялікі келіх віна, калі выпіваць штодзённа, павышаюць рызыку развіцця раку кішэчніка на 10 працэнтаў. Такія даныя прыводзяць спецыялісты Брытанскага фонду па вывучэнню ракавых захворванняў (Cancer Research UK), спасылаючыся на вынікі маштабнага даследавання, паведамляе International Journal of Cancer.

Вучоныя пад кіраўніцтвам Ціма Кея апыталі каля 480 тысяч чалавек, што пражываюць у дзесяці еўрапейскіх краінах, пра аб'ём выпітых імі спіртных напояў. Пасля гэтага на працягу шасці гадоў спецыялісты Cancer Research UK адсочвалі лёс удзельнікаў даследавання. За гэты перыяд у 1833 чалавек быў дыягнаставаны рак кішэчніка, інфармавалі вучоныя. Праведзеныя імі разлікі паказалі, што пры штодзённым ужыванні 15 грамаў чыстага алкаголю, што адпавядае 0,57 літра піва або вялікаму бакалу віна, рызыка раку тоўстай кішкі павялічваецца на 10 працэнтаў. Павелічэнне дозы алкаголю да 30 грамаў у дзень прыводзіла да павышэння рызыкі злаякаснай пухліны кішэчніка на 25 працэнтаў.

«Вынікі даследавання дастаткова дакладна сведчаць аб тым, што чым больш алкаголю вы п'яце, тым вышэй рызыка раку тоўстай кішкі», — паведаміў Цім Кей, дадаўшы, што скарачэнне прыёму алкаголю дазволіць знізіць верагоднасць развіцця цэлага шэрагу анкалагічных захворванняў. Рак тоўстай кішкі сустракаецца дастаткова часта. Толькі ў Вялікабрытаніі штогод дыягнастуецца больш як 30 тысяч новых выпадкаў захворвання.

БРЫТАНСКІЯ ВУЧОНЫЯ ЗНАЙШЛІ «ГЕН ЛЯЎШОЎ»

Вучоныя Оксфардскага ўніверсітэта адкрылі «ген ляўшоў». Вынікі даследаванняў апублікаваныя ў часопісе «Малекулярная псіхіятрыя».

Ген адыгрывае ключавую ролю ў вызначэнні часткі мозга, якая адказвае за спецыяльныя функцыі, такія, як мова і эмоцыі. У праўшэй левае паўшар'е мозга звычайна адказвае за моўную функцыю і язык, а левае — кантралюе эмоцыі. У ляўшэй усё часцей адбываецца зусім паіншаму. На гэта ўплывае «ген ляўшоў».

Вучоныя сцвярджаюць, што з-за наяўнасці гэтага гена леварукія людзі больш схільныя да захворванняў на шызафрэнію. Аднак доктар Клайд Фрэнкс, вучоны з іншай даследчыцкай групы з Оксфарда, пераканаўся, што «ляўшам не варта непакоіцца наконт гэтага, таму што існуе мноства фактараў, якія з большай верагоднасцю могуць выклікаць шызафрэнію, і пераважная большасць леварукіх людзей ніколі не сутыкнецца з гэтай хваробай». У розных краінах ужо даўно працуюць над даследаваннем ляўшэй. Аўстралійскія вучоныя высветлілі, што гэтыя людзі хутчэй ацэньваюць сітуацыю і прымаюць рашэнні ў час працэсу гульні ці заняткаў спортам, а французскія вучоныя зрабілі выснову, што ў іх заўсёды ёсць перавага ў паядынку адзін на адзін. Аднак ляўшы ўсё ж больш схільныя да некаторых захворванняў, і з імі часцей здараюцца няшчасныя выпадкі. Леварукія складаюць 10 працэнтаў ад сусветнага насельніцтва.

Інтэрфакс.

Во даюць!

«КАЛАРАДАЎ» — НА ПРЫНАДУ

Агульнавядома, што знайсці ўправу ў прыродзе на гэтага ненавіснага жука-«амерыканца» амаль што немагчыма, калі не ўлічваць тыя абставіны, што ім паласавацца (а гэта значыць, і зменшыць іх колькасць) любяць толькі фазаны ды яшчэ некаторыя птушкі. Але дзе ты набярэшся тых рэдкасных фазанаў?

Тым не менш, эксперыментаваць можна і трэба. Хоць бы ў тым напрамку, каб знайсці каларадам іншае прымяненне. І тут, як нам падаецца, першынство трэба аддаць камунальнікам з Петрыкаўскага раёна, а дакладней, спартыўнай камандзе гэтага прадпрыемства. Вось хітрыя дык хітрыя падабраліся хлопцы ў ёй. Уявіце сабе, што на старт спаборніцтваў па рыбнай лоўлі яны выйшлі з гэтымі самымі казюркамі. І розныя там плоткі, гусцёркі і ляшчы так дружна накінуліся на гэтую прынаду, што пры ўзважванні ўлову (на фінішы, значыць) каманда камунальнікаў пасарамаціла іншыя калектывы. Дарэчы, і ў асабістым заліку першым аказаўся ў раённых спаборніцтвах прадстаўнік камунальнікаў.

Вядома, такі арыгінальны падыход да каларадскага жука зацікавіў іншых рыбаловаў, і яны пачалі спрабаваць даведацца аб сакрэтах камунальнікаў. Тыя толькі сказалі, што цэлы месяц праводзілі эксперымент, а далей... далей думайце, шукайце. Наша ж парада экспериментатарам: раскрыйце тайну, раскажыце ўсім яе. На агульную карысць. Тады тысячы ахвотнікаў, аматараў рыбалкі, «узброеныя» каларадамі, дружна і з надзеяй пашыбуюць на рэкі і азёры, ручаі і сажалкі. Глядзіш — і на калгасных палях, і на дачных участках звядуцца гэтыя ненажэрныя шкоднікі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

белагропромбанк
традиции будущего

С 1 августа 2007 г. на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 25.07.2007 № 146, размер ставки рефинансирования установлен в размере 10,5 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный» и «Сберегательный», заключенных в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 на 0,25 процентных пункта с 02.09.2007.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.

Міжнародны клуб ЗВЯЗДА

НАШЫ ПАРТНЁРЫ — ПОЛЬШЧА І ПАЎДНЁВАЯ АФРЫКА

Камітэт намячае перспектывы

Своеасаблівым рухавіком беларуска-паўднёваафрыканскага дзелавога ўзаемадзеяння павінен стаць Сумесны камітэт па гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву, першае пасяджэнне якога прайшло ў Мінску ў ліпені.

На ім бакі заявілі аб сваёй гатоўнасці развіваць інвестыцыйныя і гандлёва-эканамічныя партнёрскія сувязі, а таксама ў гуманітарнай сферы. І нават абмеркавалі шэраг канкрэтных праектаў, у тым ліку звязаны з перапрацоўкай бурага вугалю ў вадкае паліва. Размова ішла аб магчымасцях рэалізацыі падобнага праекта ў Беларусі і прыцягнення ў яго паўднёваафрыканскіх інвестыцый.

Барыс ЗАЛЕСКІ, дырэктар РІА «Міжнародны клуб».

Ищем производителей
ДЕРЕВЯННЫХ СКУЛЬПТУР И СУВЕНИРНЫХ ДЕРЕВЯННЫХ ИЗДЕЛИЙ
Количество -- ОПТОВОЕ
Контакт: FHP "MADANG"
ul. Sw. Piotra 2, Gdynia, Polska / Польша.
Тел.: 8-10-48-58-6200590.
Факс: 8-10-48-58-6211620.
E-mail: madang@madang.pl

У РАЦЭ ГАНГ ПАТАНУЛІ 16 ПАЛОМНІКАЎ

У рацэ Ганг каля свяшчэннага горада індуізму Варанасі патанулі 16 паломнікаў, у асноўным жанчыны і дзеці. Аб гэтым паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы.

Трагедыя здарылася, калі перагружаная лодка, якая перавозіла людзей да месца правядзення традыцыйнага індуісцкага фестывалю, перакулілася за некалькі дзесяткаў метраў ад берагу. Выратавацца ўдалося дзевяцярым, сярод іх — уладальнік лодкі.

Лодачнік узяты пад варту, яму пагражае судовая кара за дапушчаную злачынную халатнасць — перавышэнне ў тры разы ўстаноўленых нормаў перавозкі пасажыраў, што прывяло да гібелі людзей.

Кар. БЕЛТА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.227. Індэкс 63850. Зак. № 4166. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12